Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV

№ 68 (6950)

ПЯТНІЦА

21

САКАВІКА

1941 г.

ЦАНА 10 КАП.

Сёння ў нумары

Рэспубліканская нарада работнікаў тарфяной прамысловасці закончыла сваю работу.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:
С. Конанаў — Калі партбюро мірыцца з недахопамі...
Я. Івашын — Адсутнічае выхаваўчая работа.
А. Герцовіч — Апіраючыся на шырокі партыйны актыў.

АРТЫКУЛЫ:
Б. Бенцман — Энергаўзброенасць і прадукцыйнасць працы ў прамысловасці БССР.

ПЕРАТВОРЫМ БАЛОТЫ У КВІТНЕЮЧЫЯ ПАЛІ І СЕНАЖАЦІ. Рака пачынае па новаму руслу. У сёлах Піншчыны. **А. Пятровіч** — Хлебародныя масівы.

Зладжанасць у рабоце ўсіх звенняў прадпрыемства — неабходная ўмова вытворчай культуры.

СТАЛІНСКІЯ ЛАЎРЭАТЫ. **С. Куняўскі**— Таленавіты сатырык.

ЗА РУБЯЖОМ:
Вайна ў Еўропе і Афрыцы (дзённік ваенных дзеянняў).
Сустрэча Ідэна з Сараджоглу.
Высадка англійскіх войск у Салоніках.
Юнайтэд Прэс аб згодзе Югаславіі далучыцца да пакта трох дзяржаў.
Уступленне грэчаскіх войск у Тэпелене.
Амерыканская дапамога Англіі.
Эвакуацыя дзяцей з буйных прамысловых цэнтраў Германіі.

Прызыў у школы ФЗА

Краіна наша ідзе няўхільна ўперад па шырокай дарозе перамог. Нашы перамогі і поспехі поўняць сэрцы совецкіх людзей пачуццём гордасці за сваю радзіму. Совецкі народ, кіруемы партыяй Леніна—Сталіна, ідзе цвёрдым і ўпэўненым поступам да сваёй канчатковай мэты — заяўчых вяршынь комунізма.

Няўхільна расце вытворчасць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, якая развіваецца планамерна, па законах расшыранага социялістычнага ўзнаўлення.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) паставіла перад партыяй, народам, краінай грандыёзныя задачы, выкананне якіх яшчэ больш узмоцніць эканамічную і абаронную магутнасць нашай радзімы.

Дзяржаўным планам 1941 года прадугледжана пабудаваць 2.955 новых і расшырыць існуючыя прамысловыя прадпрыемствы. Такога гіганцкага размаху, такога велічнага плана будаўніцтва не ведае і не можа ведаць ні адна капіталістычная краіна. Гэта пад сілу толькі краіне социялізма, краіне, дзе народ з'яўляецца гаспадаром усіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, дзе сам народ будуе сваю будучыню.

Рост і развіццё прамысловасці патрабуюць сістэматычнага папаўнення рабочага класа новымі кваліфікаванымі кадрамі.

Тав. Вазнесенскі ў сваім дакладзе на XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б) сказаў:

«Па ініцыятыве таварыша Сталіна партыя і ўрад у 1940 годзе прыступілі да стварэння дзяржаўных прапоўных рэзерваў шляхам падрыхтоўкі маладых кваліфікаваных кадраў у рамесленых вучылішчах і школах фабрычна-заводскага абучэння... Мерапрыемствы партыі і ўрада па стварэнню дзяржаўных прапоўных рэзерваў маюць велізарнае прынцыповае значэнне ў справе колькаснага і якаснага фарміравання рабочага класа, далейшага ўздыму нашай прамысловасці і пастаноўкі на моцную аснову ўсёй справы социялістычнага планіравання народнай гаспадаркі».

Тры месяцы вучобы ў рамесленых, чыгуначных вучылішчах і школах фзб-рычна-заводскага абучэння паказалі, што такая форма падрыхтоўкі прапоўных рэзерваў поўнасцю сябе апраўдала. Наша прамысловасць і транспарт атрымаюць новыя кваліфікаваныя кадры, якія аддадуць усе свае сілы, сваю энергію на далейшы росквіт народнай гаспадаркі.

Паводле пастановы партыі і ўрада, у гэтым годзе павінны быць падрыхтаваны кваліфікаваныя рабочыя масавых прафесій для лясной прамысловасці, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і чыгуначнага будаўніцтва.

У Беларусі ў гэтым годзе будзе адкрыта новых 49 школ ФЗА. З іх 35 школ лясной прамысловасці. 2 школы прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і 12 школ чыгуначнага будаўніцтва.

У першую чаргу павінна быць прызвана 13.700 чалавек.

Учора пачаўся прызыў у гэтыя школы.

Там, дзе партыйныя і совецкія арганізацыі зразумелі важнасць гэтага мерапрыемства, дзе падрыхтоўцы да прызыва была падана дастатковая ўвага, там дасягнуты станоўчыя вынікі.

У Беластоцкай абласці будуць адкрыты тры школы ФЗА лясной прамысловасці на 500 чалавек. Падабраны ўжо добрыя памяшканні, заканчваецца рамонт іх. Падрыхтаваны сталовыя, завозіцца абсталяванне для інтэрнатаў. Абком партыі, партыйныя і совецкія арганізацыі на месцах зрабілі ўсё неабходнае для таго, каб забяспечыць своечасовае адкрыццё школ ФЗА.

Нядрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкай да адкрыцця новых школ і ў Палескай абласці. Шэсць школ ФЗА лясной прамысловасці, у якіх будзе абучацца 1.200 чалавек, забяспечаны памяшканнямі для інтэрнатаў, сталовымі і т. д. Школа пры Бабіцкім механічным будзе мець свой клуб, стацыянарнае гукавое кіно, чытальню.

Але не ўсюды такое становішча. У Віцебскай абласці, напрыклад, трэба было пабудаваць інтэрнаты для школ ФЗА на 450 чалавек. Адказнасць за будаўніцтва павінен несці «Вітлеспром». Але, на жаль, кіраўнікі гэтай арганізацыі не адчуваюць адказнасці за гэту справу. Яны дзейнічаюць па прынцыпу—«паспеем, нашто спяшацца». А спяшацца трэба! Памяшканні павінны быць гатовы да 1 красавіка. Але калі будаўніцтва будзе весціся такімі тэмпамі, то пачатак вучобы можа аказацца пад пагрозай.

Ці разумеюць кіраўнікі «Вітлеспрома», што марудна ў будаванні інтэрнатаў для школ ФЗА прыносіць нямала шкоды справе падрыхтоўкі прапоўных рэзерваў? Здзіўляе, што партыйныя і совецкія арганізацыі не прымаюць дзейсных мер для выпраўлення становішча.

І ў Гомельскай абласці не бліскуча абстаіць справа з падрыхтоўкай памяшканняў. Для Чачэрскай школы ФЗА лясной прамысловасці трэба пабудаваць інтэрнат на 100 чалавек. Але будаўніцтва ідзе вельмі марудна. Нехапае рабочых, матэрыялаў. Калі не будуць прыняты тэрміновыя меры, гэта важная справа можа быць сарвана.

Не праяўляе патрэбнай аператыўнасці «Беллесхарчгандаль» і «Беллесснаб». Яны павінны забяспечыць школы ФЗА лясной прамысловасці абсталяваннем, прадуктамі, інструментамі. Але пакуль што нічога не робіцца. Невядома, чаго чакаюць кіраўнікі гэтых устаноў.

Прызыў пачаўся. У раённыя прызыўныя камісіі паступілі сотні і тысячы заяў аб прыёме. У гэтых заявах совецкія юнакі з сардэчнай цеплынёй і радасцю пішуць аб жаданні вучыцца і працаваць у славу нашай социялістычнай радзімы, для памнажэння яе сілы і магутнасці.

Моладзь краіны социялізма, перад якой адкрыты ўсе дарогі ў жыццё, у творчасць, добра ведае, наколькі важны ў нас усе прафесіі. Совецкі чалавек, дзе ён ні працаваў-бы, якую-б работу ён ні выконваў, добра ўсведамляе, што ён сваёй працай удзельнічае ва ўзвядзенні велічнага будынка, імя якому комунізм.

Прызыў у школы ФЗА лясной прамысловасці, прамысловасці будматэрыялаў і чыгуначнага будаўніцтва—мерапрыемства выключнай гаспадарча-палітычнай важнасці. Партыйныя і совецкія арганізацыі на месцах павінны аказаць максімальную дапамогу прызыўным камісіям у правядзенні прызыва.

Чотка, арганізавана, па-большэвіцку правядзем прызыў (мабілізацыю) у школы ФЗА!

Зварот Венгрыі ваенных спягоў венгерскай рэволюцыі 1848 года

20 сакавіка гэтага года ў будынку Цэнтральнага дома Чырвонай Арміі Генералам Арміі тав. І. В. Тюленевым, па ўпаўнаважанню Урала Саюза ССР, былі перададзены ва ўрачыстай абстаноўцы Надзвычайнаму Пасланніку і Поўнамоцнаму Міністру Венгрыі ў Маскве п. Жазефу дэ Крыштафі 56 спягоў венгерскай арміі, якія былі ўзяты войскамі цара Нікалая Першага пры падаўленні нацыянальна-вызваленчага руху венграў у 1848—1849 гг.

У Чырвонаспяжнай зале Цэнтральнага дома Чырвонай Арміі была пастроена пачотная варта. Пры перадачы венгерскіх спягоў быў выкананы Венгерскі нацыянальны гімн і Інтэрнацыянал. Пасля падпісання акта аб перадачы спягоў Генерал Арміі тав. І. В. Тюленеў і Надзвычайны Пасланнік і Поўнамоцны Міністр п. Жазеф дэ Крыштафі абмяняліся прамовамі.

У той-жа дзень венгерскія спяці ў суправаджэнні пачотнай варты і прадстаўнікоў Народнага Камісарыята Абароны Саюза ССР і Венгерскай Місіі ў Маскве былі адпраўлены на совецка-венгерскую граніцу для ўручэння спецыяльна прыбыўшай на граніцу венгерскай дэлегацыі.

Пры ўрачыстай перадачы венгерскіх спягоў прысутнічалі: Генеральны Сакратар Народнага Камісарыята Замежных Спраў тав. А. А. Собалеў, Загадчык Пратакольным Аддзелам НКЗС тав. В. Н. Баркоў, Начальнік Упраўлення Ваенных Зносін Генеральнага Штаба генерал-лейтэнант Н. І. Трубецкой, Начальнік Аддзела Ваенных Зносін НК Абароны палкоўнік А. В. Герасімаў, Камендант г. Масквы генерал-маёр В. А. Рэвякін, генерал-маёр Д. І. Гуспешаў, Намеснік Начальніка Аддзела Ваенных Зносін НК Абароны палкоўнік В. М. Драгун, в. а. дырэктара Музея Рэволюцыі тав. А. Д. Піперскі і іншыя, а таксама Ваенны Аташэ Венгерскай Місіі ў Маскве генерал Фараго і ўвесь састаў Венгерскай Місіі.

Масква—востраў Рудольфа—востраў Врангеля

Арктычны рэйс І. І. Чэравічнага

ВОСТРАЎ ВРАНГЕЛЯ, 20 сакавіка. (ТАСС). 19 сакавіка ў 23 гадзіны (па маскоўскаму часу) паветраны карабль «СССР Н-169», пілатыруемы палярным лётчыкам тав. І. І. Чэравічным, які робіць высокашыротны рэйс, падняўся з вострава Капельнага і ўзяў курс на паўночны ўсход.

20 сакавіка ў 8 гадзін 57 мінут (па маскоўскаму часу) самалёт «СССР Н-169» удачна дасягнуў вострава Врангеля і зрабіў пасадку ў бухце Роджэрса. Амаль 10 гадзін пягнуўся гэты высокашыротны рэйс. Больш 1.500 кілометраў машына прайшла над прасторамі Паўночнага Ледавітага акіяна.

Пералётам з вострава Капельнага на востраў Врангеля тав. Чэравічны закончыў першы этап высокашыротнага рэйса. Працяжнасць маршрута, па якому ляцеў самалёт «СССР Н-169» ад Масквы да вострава Врангеля, дасягае 9.000 кілометраў.

Хроніка

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР назначыў пяперашняга паверанага ў справах СССР у Вішы т. Багамолава А. Е. поўнамоцным прадстаўніком СССР у Францыі.

Рэспубліканская нарада работнікаў тарфяной прамысловасці закончыла сваю работу

Раніцою 20 сакавіка прадаўжала сваю работу рэспубліканская нарада работнікаў тарфяной прамысловасці.

Выступіўшы ў спэчках па дакладу наркампаліва БССР старшыня Тарчылаўскай торфарцелі (Віцебская абласць) тав. Брайнін заявіў:

— План па здабычы торфу арцеллю ў мінулым годзе перавыканан. Сабекошт тоны торфу даведзен да 14 рублёў 45 капеек замест 15 рублёў 77 кап., прадугледжаных планам. Значна палепшылася якасць торфу, які мае толькі 27 процантаў вільготнасці замест 33. Мы імкнуліся лепш высушыць торф. Кожны кавалак торфу пераварачвалі і пакідалі для сушкі. Зараз уся ўвага накіравана на падрыхтоўку да сезона гэтага года.

Інтэрнат, пасцельная бялізна, лазня, сталовая — усё прыведзена ў поўную гатоўнасць. Інвентар спраўлен і ўжо завозіцца на месца. У нас інвентара хапае, нават ёсць рэзерв на выпадак паломкі яго ў разгары работ. План здабычы торфу намі будзе выкананы датэрмінова.

Асінторф у мінулым годзе працаваў вельмі дрэнна. Ён недадаў краіне сотні тон таварнага торфу і гэтым выклікаў вялікія перабоі ў рабоце многіх фабрык і заводаў. Апрач выступіўшы ў спэчках дырэктар завода тав. Амельчанка прабаваў дрэнную работу завода апраўдаць усякімі аб'ектыўнымі прычынамі. З выступлення тав. Амельчанкі відаць было, што завод вельмі дрэнна падрыхтаваўся да сезона бягучага года. Кіраўніцтва гэтага завода яшчэ многа чаго недарабіла. Не прыведзена ў парадак асушальная сетка. Большасць плошчаў, дзе павінен сушыцца торф, занята торфам, які астаўся нявыбраным у мінулым годзе. Гэтая акалічнасць патрабуе ад кіраўнікоў завода максімальнай напружанасці сіл, каб найхутчэй асушыць гэты торф, аслабаніць занятую ім плошчу для сушкі новага торфу. Далёка не ўсё добра з наборам рабочай сілы: дагаворай заключана нямногім больш, чым на палавіну патрэбнай колькасці.

Са змястоўнай прамовай выступіў сакратар Гомельскага абкома КП(б)Б тав. Сырамятнікаў.

— Хоць план здабычы таварнага торфу па абласці значна перавыкананы, — гаворыць ён, — але мы не маем права зазнавацца, тым больш, што на нашых палях усё-ж асталося 8 тысяч тон нявысушанага торфу. З 39 заводаў і арцелей 5 не выканалі плана. Неабходна дабіцца, каб план выконваўся не ў сярэднім па абласці, а кожным заводам, кожнай арцеллю. Гэтага патрабуюць ад нас рашэнні XVIII партыйнай канферэнцыі.

Далей тав. Сырамятнікаў гаворыць аб заводзе «Большэвік». Завод гэты ў свой час быў арганізаван для забеспячэння палівам шклозавода імені Сталіна. Ішлі гады. Завод расшыраў сваю вытворчую магутнасць. Але Галоўшкло, пад ведамам якога знаходзіцца гэта прадпрыемства, не запікаўлена ў далейшым яго росце, бо для шклозавода дастаткова палавіны таго, што ён дае. Зыходзячы з такога меркавання, Галоўшкло праводзіць яўна антыдзяржаўную практыку, беручы курс на знішчэнне вытворчай магутнасці завода «Большэвік». Гэтага ні ў якім разе нельга дапускаць.

Далей тав. Сырамятнікаў звяртае ўвагу паралы на неабходнасць умацавання тэхнічнага кіраўніцтва вытворчымі працэсамі на здабычы і сушцы торфу. Трэба ўсіх спецыялістаў, якія адседжваюцца ў канцылярыях, накіраваць на вытворчасць. На заводах Гомельскай абласці вельмі мала спецыялістаў, і гэта, вядома, адбіваецца на іх рабоце.

Інжынер торфзавода «Дукора» тав. Шалурскі прысвяціў сваё выступленне пытанням сушкі торфу. Сушка торфу, — гаворыць ён, — робіцца на неасушаных балотах. Торф гідраскапічны, і ўсякая прысутнасць вады перапяткаджае сушцы яго. Гэта — адна з асноўных прычын невыканання заводам «Дукора» плана выпуску таварнай прадукцыі.

Тав. Шалурскі ўзняў цікавае пытанне — аб неабходнасці больш гаспадарчага выкарыстання тарфяных масіваў. Нельга дапускаць такога становішча, калі арцелі і некаторыя заводы знімаюць толькі першыя паўтара — два метры торфу, а ніз — самае каштоўнае, высокакаларыйнае паліва — не выбіраюць. Нашы кар'еры маюць глыбокі пласт торфу, які даходзіць да 5 — 6 метраў. Трэба пакончыць з варварскім выкарыстоўваннем тарфяных масіваў.

Старшыня дзяржаўнай планавай камісіі пры Соўнаркоме БССР тав Чорны спыніўся на пытаннях паліўнага балансу рэспублікі. Не глядзячы на вялікія тэмпы прыросту здабычы торфу, узровень выпрацоўкі яго ўсё-ж адстае ад патрэб гаспадаркі.

Тав. Чорны ўнёс прапанову скараціць тэрмін здабычы торфу.

Загадчык аддзела паліўнай прамысловасці ЦК КП(б)Б тав. Юдасін падверг рэзкай крытыцы работу Наркамата мясцовай паліўнай прамысловасці БССР. Распаралжэнні і загады гэтага наркамата насілі часта фармальны характар. У практыцы работы наркамата быў, напрыклад, такі выпадак, калі загадам ад 22 лютага дырэктару Асінторфа прапаноўвалася распрацаваць 22 лютага практычныя мерапрыемствы па здабычы торфу. Сёння рыхтуецца загад, і сёння-ж трэба яго выканаць. Не дайшоў яшчэ ён да дырэктара завода, як ужо страціў сваё значэнне.

На вячэрнім пасяджэнні з абшырнай прамовай выступіў намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Захараў. Падкрэсліўшы выключнае значэнне развіцця тарфяной прамысловасці як энергетычнай базы для ўсёй народнай гаспадаркі краіны, тав. Захараў указаў на неабходнасць скараціць тэрміны выканання плана як здабычы, так і сушкі торфу.

— Нельга трапіць час на «раскачку», —гаворыць тав. Захараў.—Трэба з першага-ж дня пускаць у работу ўсе агрэгаты. Выкананне плана трэба лічыць не па здабычы, а па вырабу таварнай прадукцыі. Тыя кіраўнікі, якія пакідаюць на палях нявысушаны торф, робяць вялікае злачынства перад дзяржавай.

У заключэнне выступіў намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Ванееў. Ён заклікаў усіх работнікаў тарфяной прамысловасці, і асабліва інжынерна-тэхнічны персанал, па-большэвіцку змагацца за датэрміновае выкананне плана здабычы і сушкі торфу.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі таксама тт. Сцяпанаў—інжынер Дзяржплана БССР, Фрадкін—начальнік Галоўторфа. Усяго на нарадзе выступіла 29 чалавек.

Удзельнікі нарады вылучылі камісію, якой даручана распрацаваць практычныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню торфсезона 1941 года.

На гэтым нарада закончыла сваю работу.

У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПРЫЗЫВА

Многа юнакоў сабралося ў прыёмнай старшыні выканкома Мінскага райсавета, яны чакаюць, калі пачне работу прызыўная камісія.

З калгаса імені Варашылава Абчацкага сельсавета на прызыў з'явіліся тры 17-гадовыя хлопцы—Павел Кароткі, Владзімір Сакольчык і Кастусь Гусеў. Яны яшчэ надасвеце прыехалі ў горад, першымі з'явіліся ў выканком. Кожны з іх заклапочан: прымуць ці не? Тут-жа знаходзяцца маладыя калгаснікі з сельгасарцелей імені Варашылава, «Чырвоны баец» і іншых калгасаў Мінскага раёна.

Камісія пад старшынствам старшыні выканкома Мінскага райсавета тав. Германа пачынае сваю работу. Крыху хвалюючыся, да стала падыходзіць рослы 17-гадовы юнак.

— Як завуць? — пытае старшыня камісіі.

— Меляшкевіч Стась Іванавіч.

— Адкуль?

— З калгаса «Чырвоны баец»,—адказвае Стась.

— Якая ў вас сям'я? — пытае адзін з членаў камісіі.

— У сям'і 6 чалавек. Два маіх браты служаць у Чырвонай Арміі, сястра працуе ўрачом.

— Якую хочаце атрымаць спецыяльнасць? — зноў звяртаецца да Стася старшыня.

— Возчыкам хачу быць, — адказвае той. — Я коней люблю. Хачу працаваць на іх.

— Добра. Вы залічваецеся ў Чэрвеньскую школу ФЗА лясной прамысловасці, — аб'яўляе старшыня. — Зараз можаце атрымаць пуцёўку.

— Дзякую вам. Абяцаю вучыцца толькі на выдатна, а працаваць пастаханаўску.

Стась адыходзіць ад стала. Старшыня выклікае Алеся Якубовіча. Члены камісіі задаюць яму рад пытанняў. Нарэшце старшыня аб'яўляе аб залічэнні яго ў школу ФЗА. Алесь, задаволены, выходзіць у прыёмны пакой. Ято абступаюць юнакі, засыпаюць пытаннямі. Алесь коратка адказвае:

— Залічылі.

Разам з Стасем ён спяшыць у другі пакой, дзе прызыўнікам выдаюць пуцёўкі. Вось доўгачаканы дакумент атрыман. Стась чытае ўголас:

— З'явіцца ў горад Чэрвень у школу ФЗА лясной прамысловасці № 56 12 красавіка 1941 года.

Перад прызыўной камісіяй праходзяць усё новыя і новыя юнакі. 12 з іх моцных і вынослівых залічылі ў Чэрвеньскую школу ФЗА. Праз некаторы час яны стануць спецыялістамі лясной прамысловасці, сваёй стаханаўскай працай будуць множыць багацці нашай социялістычнай радзімы.

Р. СЯРГЕЕЎ.

***

МАЗЫР, 20 сакавіка. Ва ўсіх раёнах Палесся сёння пачаўся прызыў у школы ФЗА лясной прамысловасці.

Святочна ўпрыгожаны Дом социялістычнай культуры гарадскога пасёлка Жыткавічы з самай раніцы запоўніла жыццёрадасная моладзь. З вялікай цікавасцю яна праслухала гутаркі агітатара т. Грыбко аб значэнні лесаматэрыялаў у эканоміцы краіны, аб знатных лесарубах Вайстрацэнку, Гоціне і іншых.

Затым пачала працаваць камісія па прызыву. Першымі прыняты ў школы ФЗА маладыя калгаснікі-стаханаўцы Міхаіл Алінскі, Нікалай Саўчык, Пётр Некрашэвіч.

Арганізавана прайшоў першы дзень прызыва таксама ў Хойніцкім, Лельчыцкім, Калінкавіцкім і Ельскім раёнах вобласці.

(БЕЛТА).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ВОПЫТНІКАЎ ПА ВІНАГРАДУ І БАХЧАВЫХ КУЛЬТУРАХ

Тысячы гектараў маладых садоў і ягаднікаў упрыгожваюць калгасы і соўгасы нашай рэспублікі. У 1940 годзе ў Беларусі налічвалася 75.000 гектараў пладовых насаджэнняў. У 154 пладовых расадніках штогод вырошчваецца 4,5 мільёна маладых яблынь і груш.

Паступова вывучаецца і пачынае ўкараняцца ў калгасах рэспублікі паўднёвая культура — вінаград. Настаўнік Гомельскай школы Нікалай Міцераў, поспехі якога шырока будуць паказаны сёлета на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, побач з вінаградам акліматызаваў грэцкі арэх, разводзіць тутавае дрэва.

Больш чым у 100 пунктах рэспублікі зарэгістраваны вопытнікі-мічурынцы, якія вырошчваюць вінаград. У адной толькі Палескай абласці налічваецца 3.818 кустоў вінаграда, у Гомельскай — 1.838 кустоў. Вінаград пачынаюць вырошчваць у Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай, Пінскай і Вілейскай абласцях.

На калгасных гародах Гомельшчыны з поспехам вырошчваюць кавуны. Адзін з піонераў гэтай справы, тав. Дараноўскі (Лоеўскі раён) атрымаў з аднаго гектара 437 цэнтнераў кавуноў. Вялікае значэнне набываюць і цытрусавыя расліны — лімоны, апельсіны, якія вырошчваюцца ў хатніх умовах.

Наспела патрэбнасць усебакова абмеркаваць, якія сарты вінаграда, кавуноў і іншых паўднёвых культур лепш вырошчваць ва ўмовах Беларусі.

Усе гэтыя пытанні абмяркоўвае скліканая ўчора ў Лошыцы ўсебеларуская нарада вопытнікаў-мічурынцаў, якія вырошчваюць вінаград, бахчавыя і цытрусавыя культуры. На нараду прыбылі з раёнаў рэспублікі 42 вопытнікі.

Учора ўвечары нарада заслухала даклад дырэктара Беларускай навукова-даследчай пладова-гародніннай станцыі тав. Сокалава і інфармацыі навуковых работнікаў Акадэміі навук БССР.

Сёння на нарадзе выступяць прыбыўшыя з раёнаў вопытнікі-мічурынцы.

Па Совецкай краіне

«ІВАН СУСАНІН» НА КЛУБНАЙ СЦЭНЕ

Больш 20 год існуе пры Орэхава-Зуеўскім палацы культуры оперны калектыў. Большасць удзельнікаў яго — рабочыя-тэкстыльшчыкі, любіцелі вакальнага і сцэнічнага мастацтва. На клубнай сцэне пастаўлены оперы «Фаўст», «Еўгеній Онегін», «Русалка» і інш. Зараз калектыў працуе над операй Глінкі «Іван Сусанін».

У друкарнях «Печатный Двор імені Горкага (Ленінград) пачалося друкаванне першага тома чацвертага выдання твораў В. І. Леніна. На злымку: стаханаўка комсамолка Р. Кулікава працуе над пазалотай пераплёту першага тома.

Фото Г. Чэртова. (Фотахроніка ТАСС).

НА ДАЧЫ А. М. ГОРКАГА Ў КІР'ЯВАЛЕ

Поўтода назад паводле пастановы Соўнаркома СССР у мястэчку Кір'явале, паблізу станцыі Мустамякі, на Карэльскім перашэйку адкрыўся музей-дача А. М. Горкага. Агледжваць музей прыязджаюць з розных канцоў краіны. Вялікую цікавасць да музеядачы праяўляюць мясцовыя калгаснікі. (ТАСС).

ПЕРШЫ РАБОЧЫ КЛУБ

У Рыце адкрыўся першы раённы рабочы клуб. У ім захоўваецца чырвоны спяг рабочых арганізацый Маскоўскага раёна, выратаваны ў час разгрома латвійскіх левых профарганізацый у 1927 г. У апошнія годы гэты спяг захоўваў рабочы Самуйлаў, назначаны зараз загадчыкам клуба.

(ТАСС).

«ГІСТОРЫЯ КАЗАХСКАЙ ССР»

АЛМА-АТА. Казахскі філіял Акадэміі навук СССР падрыхтоўвае выпуск 4-гомнай «Гісторыі Казахскай ССР». Чатырохтомнік ахваціць гісторыю Казахстана ад старажытнейшых часоў да нашых дзён. Два першыя томы будуць закончаны ў жніўні гэтага года.

ПАДПІСКА НА ЧАЦВЕРТАЕ ВЫДАННЕ ТВОРАЎ В. І. ЛЕНІНА

Паспяхова прадаўжаецца ў краіне падпіска на чацвертае выданне твораў В. І. Леніна. У Маскву ў 55 магазінах афармілі падпіску ў індывідуальным парадку 29 тысяч чалавек. Ад бібліятэк, ВНУ, навуковых і іншых устаноў пры нята падпіска амаль на 13 тысяч экземпляраў. У Туле, Орле, Свердлоўску, Львове, Чэрнавіцах, Брэсце, Драгобычы і многіх іншых гарадах падпіска сярод насельніцтва ўжо закончана.

(ТАСС).

ПАДРЫХТОЎКА ДА ДЗКАДЫ ЛІТОЎСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

КАУНАС, (ТАСС). У рэспубліцы разгарнулася дзейная падрыхтоўка да надыходзячай дэкады літоўскага мастацтва ў Маскве. У каўнаскім тэатры оперы і балета ідуць рэпетыцыі оперы кампазітара Стасіса Шымкуса «Сяло ля памеця», якую мяркуецца паказаць маскоўскаму гледачу. Рыхтуецца опера Мікаса Петраўскаса «Эгле, каралева ужэй», напісаная па матывах літоўскай народнай казкі.

Вільнюскі драматычны тэатр ставіць новую п'есу літоўскага пісьменніка прафесара Б. Сруогі аб паўстанні сялян у першай палавіне XVIII века. У ёй шырока скарыстан літоўскі фальклор.

Створаны нядаўна народны ансамбль літоўскай Дзяржаўнай філармоніі развучвае старынныя песні і пляскі. У маі ў Вільнюсе адкрыецца рэспубліканская мастацкая выстаўка. Лепшыя карціны будуць пасланы ў Маскву. Арганізуюцца конкурсы музыкантаў.

ВАТА З ШЛАКА

У Харкаўскім цэнтральным навукова-даследчым інстытуце будаўнічых матэрыялаў скансструіравана ўстаноўка для атрымання мінеральнай ваты без прымянення пара. Яна складаецца з вагранкі і матора. Расплаўлены шлак падае на верцячыйся ля вагранкі з велізарнай скорасцю вялікі дыск і выцягваецца ў танчэйшую нітку, якая затым асядае ў выглядзе лёгкай пушыстай ваты. Прамысловая ўстаноўка будзе даваць 0,5 тоны ваты ў гадзіну.

(ТАСС).

ЧАТЫРЫ ЗЕМЛЕТРАСЕННІ

У нядзелю, 16 сакавіка, Цэнтральная сейсмічная станцыя СССР «Масква» зарэгістрыравала чатыры землетрасенні. У 7 гадзін 52 мінуты па грынвіцкаму часу зарэгістравана землетрасенне, якое адбылося на адлегласці 6.900 кілометраў ад Масквы. Эпіцэнтр яго знаходзіцца ў раёне паўднёвай аканечнасці Камчаткі. У 16 гадзін 40 мін. адзначана землетрасенне, эпіцэнтр якога размешчан у Міжземным моры каля паўднёвай часткі Італіі (2.800 км. ад Масквы). Глыбіня ачага каля 100 км. У 18 гадзін 53 мінуты прыборы станцыі адзначылі паўторнае землетрасенне ў гэтым-жа раёне. У 21 гадзіну 04 мін. запісана чацвертае землетрасенне, настолькі слабае, што адлегласць яго ад Масквы вызначыць не ўдалося.

ЖАЛЕЗНАЯ РУДА Ў ЛІТВЕ

Упершыню літоўскія геолагі ўстанавілі наяўнасць жалезнай руды на поўначы рэспублікі, у Ракішскім павеце і на поўдні — у Казлу-Руда. На развіццё геолагаразведчай работы ў гэтым годзе адпушчана звыш мільёна рублёў. Буржуазны ўрад Літвы адпускаў на гэтыя работы толькі тры-пяць тысяч рублёў у год. (ТАСС).

НОВЫЯ МАШЫНЫ ДЛЯ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

У Ленінградзе на мясакамбінаце імені Кірава закончан мантаж механізаванай устаноўкі для з'ёмкі скур з буйнай рататай жывёлы. За змену можна знімаць і транспартываць на склад паўтары тысячы скур. Устаноўлены на маслазаводзе № 7 першы совецкі экспелер—бесперапынна дзеючы маслаадымны прэс — значна скарачае прамысловыя адходы масла.



Адкрылася навігацыя на Азоўскім моры. Прыбыўшы першым рэйсам цеплаход «П. Осіпенка» даставіў у Марыупальскі порт руду для металургічных заводаў.

Фото П. Кашкеля. (Фотахроніка ТАСС).

Партыйнае жыццё

Калі партбюро мірыцца з недахопамі...

Начальнік штамповачнага цэха дакладваў дырэктару: — Цэх пад пагрозай спынення работы; жалеза профілю 7[illegible] хопіць не больш як на чэцвера.

— Завод «Ударнік» можа не выканаць ніякавіцкай праграмы, — паведамляў у трэст і наркамат дырэктар тав. Агінец.— вышлі запасы важнейшай сыравіны: лайсте жалеза 75×25!.

А ў першыя дні сакавіка 1941 года, калі па-веснавому свяціла сонца і таяў снег, Агінец вышаў неяк з свайго кабінета і зірнуў на двор даручанага яму завода: груды снегу на яго вачах ператвараліся ў горы металічнага і чыгуннага лому. Абсыхала на сонцы сталь, жалеза. Каштоўнейшыя металы згубілі свой колер і пакрыліся тоўстым пластом іржы. На дварэ час-ад-часу паяўляліся рабочыя. Яны выцягвалі часткі жалеза і знікалі за звярыма штамповачнага цэха.

Да дырэктара звярнуўся начальнік штамповачнага цэха тав. Камянецкі.

— Тав. Агінец, падзівіся, што мае хлопцы знайшлі!

Кіраўнік завода накіраваўся на тое месца, адкуль штамповачыкі выцягвалі нядаўна сыравіну. Ён, як і начальнік цэха, не верыў сваім вачам: на месцы адтаяўшага снегу, у лужах валы ляжаў сапраўдны скарб — жалеза 75×25.

— Вось знаходка, цяпер сыравіны больш як на месяц хопіць! — узрадаваўся дырэктар і ціха дадаў: — Толькі ты, браток Камянецкі, не расказвай нікому аб нашай знаходцы; куры будуць смяяцца з нас, я-ж шукаў гэтага жалеза ў трэсце, у наркамаце.

Гэта «ажрыццё» ярка характарызуе і стан уліку на заводзе «Ударнік», і стыль работы кіраўнікоў гэтага прадпрыемства, і парадак на ім. Не толькі на дварэ, але і ў цэхах завода адсутнічае элементарны парадак, культура і чыстата.

Заходзім у інструментальны і механічны цэхі. Паллота зарасла тоўстым пластом бруду, усюды валяецца смецце, на кожным кроку—часткі розных машын, кавалкі метала, дэталі. Рабочыя месцы таксама ў брудным стане, загружаны прадукцыяй і сыравінай. Станкі і машыны брудныя, запушчаныя.

Слесар-стаханавец т. Чудаеўскі разабраў адзін такарны станок. Ён каштаваў заводу 11.800 руб., але на працягу двух год ні разу не аглядаўся тэхнічным адзелам і не атрымліваў ніякага рамонту. У сярэдзіне машыны — іржа, смала, металічныя стружкі. Слесар паказвае больш дзесятка важнейшых частак, якія палопаліся і дачасна прышлі ў негодную.

Многія станкі хістаюцца з-за няспраўнасці фундаментаў. У такім-жа запушчаным стане 6 такарных станкоў, якія знаходзяцца ў зборачных цэхах. За імі няма патрэбнага догляду. У ліцейным цэху на працягу двух месяцаў стаіць няспраўны паз'ёмнік. У штамповачным цэху вышаў са строю фракцыйны прэс. У ліцейным цэху няспраўна вентыляцыя. Лесніцы, вокны, сцены, відаць, даўным-даўно не чысціліся.

— Чаму не памыеце, не пачысціце?— пытаем мы.

— А хіба ўжо скора свята?—здзіўлена таварыш прыбіральшчыцы. Аказваецца, на заводзе ўстанавілася традыцыя: толькі перад Першым мая і кастрычніцкімі святамі мыюць вокны, лесніцы, здымаюць са сцен пыл і павуцінне.

З 1 сакавіка завод перайшоў на работу па графіку.

Але ў арганізацыі работы па графіку ёсць вялікі прабел. Складзенае планавым адзелам дзённае заданне вывешваецца за дзень раней у цэхах. Дырэкцыя завода і начальнікі цэхаў рашылі, што гэтага дастаткова, каб цэхі і кожны станок працавалі зладжана, рытмічна. У многіх цэхах не праводзяцца нават вытворчыя нарады. Кантроль над выкананнем графіка слабы.

За першую дэкаду сакавіка завод павінен быў выпусціць 12 трохтонных вагаў, а выпусціў толькі 3, замест 120 пяцікілаграмных вагаў выпусціў 58; павінен быў вырабіць 1024 дваццацікілаграмныя бязмены, а выпусціў 892. Зусім сарван выпуск камбінірованых замкоў.

Культурная высокаарганізаваная работа нямысліма без цвёрдага тэхналагічнага рэжыму. На заводзе-ж «Ударнік» тэхналогія распрацавана толькі па двух (з 13) відах прадукцыі. Прадукцыя тут вырабляецца «на авось», «па прывычцы», як кажуць у цэхах. І невыпадкова цэхі выпускаюць многа браку.

Усе гэтыя пералодкі тармозяць работу прадпрыемства. Аднак бюро партарганізацыі завода праходзіць міма іх, не мабілізуе на барацьбу з імі камуністаў і ўсіх рабочых завода.

Бюро партарганізацыі нярэдка заслухоўвае на сваіх пасяджэннях даклады дырэктара, тэхнічнага дырэктара, начальнікаў і майстраў цэхаў—камуністаў. Але, выносячы рашэнні, бюро не дабіваецца іх ажыццяўлення.

Напрыклад, у пачатку мінулага года завод атрымаў заданне — асвоіць выпуск сярэдняга замка. Заданне не такое ўжо складанае. Але тэхнічнаму дырэктару завода «Ударнік» комуністу т. Гітліну, канструктарам і тэхнолагам завода заданне гэта чамусьці аказалася «не пад сілу».

Партыйнае бюро не магло, вядома, раўнадушна глядзець на бездапаможнасць тэхнічнага адзела. 21 красавіка 1940 года партбюро на сваім пасяджэнні абмеркавала ход асваення сярэдняга замка на заводзе і прыняла адпаведнае рашэнне.

Быў устаноўлен тэрмін выканання — 27 красавіка.

Прайшло месяцы тры, сакратар і члены партбюро напэўна забыліся ўжо аб сваім мінулым рашэнні. На пасяджэнні 20 ліпеня яны зноў прапануюць кіраўнікам завода: «Прыступіць да выпуску сярэдняга замка — тэрмін 20 жніўня».

Месяцы праз тры на пасяджэнні партбюро 17 кастрычніка выяўляецца, што мінулыя рашэнні па пытанню асваення сярэдняга замка «поўнасцю не выкананы». Партбюро зноў прапануе: «Закончыць штампы сярэдняга замка да 20 лістапада і ў трэцяй дэкадзе прыступіць да вырабу замкоў».

Мінуў 1940 год. 8 сакавіка 1941 года партбюро зноў абмяркоўвае пытанне аб асваенні таго-ж сярэдняга замка. У чацверты раз выступае з дакладам т. Гітлін, у чацверты раз ён дае слова асвоіць у бліжэйшы час замок. І бюро партарганізацыі яшчэ раз прапануе яму: к 1 красавіка закончыць падрыхтоўчыя работы да выпуску сярэдняга замка.

Колькі яшчэ разоў партбюро завода будзе выносіць такія рашэнні?

С. КОНАНАЎ.

г. Мінск.

На 3-м тэкстыльным камбінаце г. Беластока. Зменны майстар ткацкага цэха А. Калеснікава (злева) правярае якасць работы маладой ткачыхі комсамольска-маладзёжнай брыгады В. Блондэс.

Фото А. Сапіра. (БЕЛТА).

АДСУТНІЧАЕ ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА

У комсамольскай арганізацыі Новапагосцкага сельсовета Міорскага раёна 16 чалавек. Большасць іх — юнакі, нядаўна прынятыя ў комсамол. Яны з вялікім натхненнем імкнуцца да грамадскай работы. Аднак гэта імкненне не сустракае належнага падтрымання. Унутрысаюзная і выхаваўчая работа ў комсамольскай арганізацыі пастаўлена нездавальняюча.

Большасці комсамольцаў неабходна пачаць вывучэнне элементарных пытанняў палітграматы, але нічога канкрэтнага ў гэтым напрамку не робіцца. Нават комсамольцы—настаўнікі і мелыпынскія сакратнікі, якія маюць вышэйшую і сярэднюю асвету, самастойна не вывучаюць марксісцка-ленінскай тэорыі.

Дрэнна арганізаван у Новым Пагосце адпачынак моладзі. Адзіным месцам культурнага адпачынку моладзі з'яўляецца хата-чытальня. Але там нічога не робіцца для задавальнення культурных запатрабаванняў моладзі. Загадчык хаты-чытальні тав. Красікаў нічога не робіць, комсамольская арганізацыя не прымае амаль ніякага ўдзелу ў рабоце хаты-чытальні. У хаце-чытальні не праводзяцца нават гутаркі па пытаннях бягучай палітыкі і чыткі газет. Праўда, у плане работы хаты-чытальні намечаны гутаркі і даклады, вызначаны бяседчыкі — комсамольцы тт. Варанковіч (настаўніца), Бобр (піонерважатая), Кацельнікава (сакратар арганізацыі ЛКСМБ) і іншыя. Але ніхто з гэтых таварышоў не выканаў даручэння.

Адсутнасць саюзнай дысцыпліны і выхаваўчай работы прыводзіць да бытавога разлажэння асобных комсамольцаў. Нядаўна прыняты ў комсамол Папкоў за п'янства і прысваенне дзяржаўных грошай выключан з ЛКСМБ.

Такія нездаровыя з'явішчы ў Новапагосцкай комсамольскай арганізацыі тлумачацца тым, што работай гэтай арганізацыі не цікавяцца і не кіруюць ні райком комсамола, ні райком партыі.

Я. ІВАШЫН.

Энергаўзброенасць і прадукцыйнасць працы ў прамысловасці БССР

Марксізм-ленінізм вучыць, што прадукцыйнасць працы мае рашаючае значэнне для канчатковай перамогі сацыялістычнага спосабу вытворчасці над капіталістычным. Гэта важнейшае палажэнне не раз падкрэслівалася ў працах Леніна і Сталіна. На базе высокай прадукцыйнасці працы сацыялізм можа, павінен і абавязкова пераможа капіталістычную сістэму гаспадаркі. Адным з найбольш яркіх выражэнняў пераваг сацыялізма над капіталізмам з'яўляецца рост прадукцыйнасці працы ў прамысловасці і іншых галінах народнай гаспадаркі СССР тэмпамі, недасягальнымі для капіталізма. Але перагнаўшы капіталістычныя краіны па тэмпах росту, мы ўсё яшчэ адстаем ад найбольш развітых капіталістычных краін па ўзроўню прадукцыйнасці працы.

Сістэматычнае павышэнне прадукцыйнасці працы ў сацыялістычнай народнай гаспадарцы з'яўляецца важнейшым фактарам расшыранага сацыялістычнага ўзнаўлення.

Калі, напрыклад, у канцы першай пяцігодкі рост прадукцыі буйнай сацыялістычнай прамысловасці СССР забяспечваўся амаль на дзве трэціх павелічэннем колькасці рабочых і прыкладна на адну трэць ростам прадукцыйнасці працы, то ў канцы другой пяцігодкі рост прамысловай прадукцыі звыш чым на дзве трэціх забяспечваўся павышэннем прадукцыйнасці працы і менш чым на адну трэць ростам колькасці рабочых.

У прамысловасці БССР за лік росту прадукцыйнасці працы, па зробленых намі падліках, было атрымана каля 70 процантаў усяго прыросту прадукцыі ў другой пяцігодцы. А па такіх галінах, як здабыча торфу, вытворчасць буматэрыялаў, дрэваапрацоўчая прамысловасць, прырост прадукцыі звыш чым на 4/5 пакрываўся павелічэннем прадукцыйнасці працы. У той-жа час павышэнне прадукцыйнасці працы з'яўляецца асновай росту заработнай платы і сацыялістычнага накаплення.

Велізарнае значэнне мае далейшае павышэнне прадукцыйнасці працы для ажыццяўлення гістарычнай задачы — паступовага пераходу ад сацыялізма да комунізма, для вырашэння асноўнай эканамічнай задачы СССР — дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах. Таварыш Сталін вучыць нас, што «чым вышэй будзе ў нас прадукцыйнасць працы, чым больш удасканальваецца будзе ў нас тэхніка вытворчасці, тым хутчэй можна будзе выканаць гэту важнейшую эканамічную задачу, тым больш можна будзе скараціць тэрміны выканання гэтай задачы». (Сталін. Даклад на XVIII з'ездзе ВКП(б).

Выключнае значэнне набывае павышэнне прадукцыйнасці працы на нашых сацыялістычных фабрыках і заводах, саўгасах і калгасах, у дзяржаўных установах і гаспадарчым апараце ў сучаснай складанейшай міжнароднай абстаноўцы, багатай усякімі нечаканасцямі. Чым вышэй будзе прадукцыйнасць працы, т. зн. чым менш будзе затрачвацца працы, матэрыялаў, паліва, электраэнергіі і абсталявання на выраб адзінкі прадукцыі высокай якасці, тым больш атрымаем мы паліва, метала, станкоў, машын, гармат, самалётаў, танкаў, а таксама прадметаў шырокага спажывання з нашых рэсурсаў. Гэта значыць, што мы зможам яшчэ лепш узброіць нашу доблесную Чырвоную Армію ваеннай тэхнікай і разам з тым яшчэ больш умацуем эканамічную магутнасць краіны, павялічым народнае багацце. Вось чаму рост сацыялістычнай прадукцыйнасці працы — важнейшы фактар далейшага ўмацавання тэхніка-эканамічнай незалежнасці і абароназдольнасці нашай вялікай сацыялістычнай радзімы.

***

Намячаючы шляхі развіцця сацыялістычнай прадукцыйнасці працы, Ленін і Сталін не раз падкрэслівалі тое асаблівае значэнне, якое мае ў гэтым працэсе раз віццё, унядрэнне і асваенне тэхнікі ў сацыялістычнай вытворчасці. Тэхнічнае ўзбраенне сацыялістычнай прамысловасці з'яўляецца магутнейшай зброяй у барацьбе за дасягненне прадукцыйнасці працы, дастойнай комуністычнага грамадства. Паспяховае ажыццяўленне сталінскіх пяцігодак дало магчымасць узброіць сацыялістычную працу першакласнай тэхнікай, электрычнасцю, высокапрадукцыйнымі машынамі.

Перавагі развіцця і скарыстання тэхнікі ў сацыялістычнай гаспадарцы абумоўліваюцца перавагамі сацыялістычнай эканомікі, якая базіруецца на дыяметральна процілеглых законах развіцця, чым капіталістычная эканоміка. «Сацыялістычная сістэма гаспадаркі дала нам магчымасць у некалькі год пераабсталяваць усю нашу сацыялістычную прамысловасць на новай сучаснай тэхнічнай базе, такой магчымасці не дае і не можа даць капіталістычная сістэма гаспадаркі» (Сталін. Даклад на XVIII з'ездзе ВКП(б).

Абсталяванне нашай сацыялістычнай прамысловасці з'яўляецца самым малодым у свеце. Палавіна станочнага парка, які меўся ў наяўнасці на 1 студзеня 1938 года, выпушчана за годы другой пяцігодкі. 4/5 усіх паравых турбін, якія меліся на 1 студзеня 1936 года, былі ўстаноўлены ў 1929—1935 гг. У гэты-ж перыяд было ўведзена ў дзеянне 77,2 проц. магутнасці генератараў. У той-жа час у Злучаных Штатах Амерыкі ўдзельная вага абсталявання ўзростам ад 1 да 10 год складала: па магутнасці паравых турбін 51 проц., па магутнасці генератараў пераменнага току 47 проц., а пастаяннага току—32 проц.

Адным з важнейшых паказальнікаў узроўню тэхнічнага развіцця з'яўляецца каэфіцыент электрыфікацыі вытворчых працэсаў, г. зн. удзельная вага электрычнай энергіі ва ўсёй суме энергіі, якая прымяняецца ў вытворчасці, бо электрычнасць гэта — вяршыня сучаснай тэхнікі.

Па каэфіцыенту электрыфікацыі прамысловасць СССР абагнала прамысловасць Англіі і Германіі і знаходзіцца на ўзроўні прамысловасці Злучаных Штатаў Амерыкі. Аднак, узровень тэхнікі капіталістычных краін не стаіць на адным месцы. Пагаршаемая вайной, ліхарадачна працуе ў буржуазных краінах тэхнічная мысль. Многа новага стварацца асабліва ў ваеннай прамысловасці. І мы павінны няспынна сачыць за ўсім тым новым, што паяўляецца ў тэхніцы і прамысловасці капіталістычных краін. Не супакойвацца на дасягненнях нашай тэхнікі, а пастомна ўдасканальваць і развіваць новую тэхніку.

Разам з народнай гаспадаркай СССР тэхнічна перабудоўвалася народная гаспадарка БССР — арганічнай састаўной часткі вялікага Совецкага Саюза.

Да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі прадукцыйнасць працы ў поўсаматужнай прамысловасці Беларусі знаходзілася на выключна нізкім узроўні. Вельмі нізкім быў і ўзровень тэхнічнага развіцця беларускай прамысловасці. Дастаткова сказаць, што ў 1913 годзе на душу насельніцтва Беларусі прыходзілася ў 15 разоў менш электраэнергіі, чым у сярэднім у Расіі.

Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка, сацыялістычная сістэма народнай гаспадаркі абумовілі быстрыя тэмпы ўздыму гаспадаркі і культуры БССР, ліквідацыю яе гаспадарчай адсталасці. У выніку ажыццяўлення сталінскіх пяцігодак у БССР мы дабіліся велізарных поспехаў у тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасці, у механізацыі працаёмкіх і цяжкіх работ, у электрыфікацыі прамысловасці і аўтаматызацыі працэсаў вытворчасці ў асобных галінах. Створана сучасная перадавая прамысловасць, якая ў значнай меры скарыстоўвае мясцовыя сыравінныя і энергетычныя рэсурсы.

За перыяд з 1928 па 1939 год асноўныя фонды сацыялістычнай прамысловасці БССР выраслі ў 12,5 раза пры адначасовым росце колькасці рабочых у 3,3 раза. Гэта значыць, што ўзброенасць нашых рабочых тэхнікай — машынамі, прыладамі ўзрасла больш чым у тры разы, а ўмовы працы карэнным чынам палепшыліся.

Вырасла на новай якаснай аснове энергетычная база народнай гаспадаркі. У 1938 годзе магутнасць первічных рухавікоў ва ўсходніх абласцях БССР была ў 9 разоў больш, чым у даваенны час, з магутнасць электрастанцый у 17 разоў больш. За годы другой пяцігодкі вытворчасць электраэнергіі вырасла амаль у 2,5 раза. Параўнальна з даваенным часам вытворчасць электраэнергіі вырасла больш чым у 20 разоў. Але быстра растучая прамысловасць прад'яўляе ўсё новыя, больш высокія патрабаванні да электраэнергетычнай базы. Адзначанае тав. Молатавым адноснае адставанне электраэнергетыкі ад агульных быстрых тэмпаў развіцця народнай гаспадаркі мела месца і ў БССР. Ліквідуючы вынікі шкодніцкага тармажэння развіцця энергетыкі ў БССР, мы павінны дабівацца далейшага паляпшэння энергагаспадаркі. Рост электраэнергетыкі павінен не толькі апярэджваць рост прамысловасці, але і забяспечыць «стварэнне значных рэзерваў электрычных магутнасцей» (з рэзалюцыі XVIII з'езда ВКП(б).

Рост тэхнічнай узброенасці і электрыфікацыі вытворчых працэсаў у прамысловасці БССР знаходзіць сваё выражэнне ў павышэнні энерга- і электраўзброенасці працы.

Пад энергаўзброенасцю працы мы разумеем тую колькасць механічнай і электрычнай энергіі, якой узброен у сярэднім адзін рабочы па вытворчасці.

Рост энерга- і электраўзброенасці працы прамысловасці БССР адбываўся, з аднаго боку, за лік энергафікацыі асобных галін, а з другога—за лік структурных змен у прамысловасці, павышэння ўдзельнай вагі энергаёмкіх вытворчасцей. Удзельная вага, напрыклад, металаапрацоўчай прамысловасці ў агульнай суме прамысловай прадукцыі БССР безупынна павялічваецца. Адзін толькі прырост прадукцыі за першыя два годы трэцяй пяцігодкі ў 17 разоў перавышае ўвесь аб'ём прадукцыі металаапрацоўкі Беларусі ў даваенны час.

Рост энергаўзброенасці працы ва ўмовах сацыялістычных вытворчых адносін спалучаецца з асваеннем тэхнікі і павышэннем ступені яе скарыстання. Выражэннем эканамічнай эфектыўнасці гэтага працэса з'яўляецца павышэнне прадукцыйнасці працы. Пры гэтым тэмпы павелічэння прадукцыйнасці працы павінны прагрэсіўна перавышаць тэмпы росту энерга- і электраўзброенасці працы. Гэта заканамернасць развіцця сацыялістычнай прамысловасці пацвярджаецца, у прыватнасці, канкрэтным матэрыялам прамысловасці БССР. Так, напрыклад, энергаўзброенасць працы ў буйнай прамысловасці БССР за перыяд другой пяцігодкі павялічылася на 38 проц., а электраўзброенасць—на 52 проц.; у гэты-ж час прадукцыйнасць працы ў прамысловасці БССР вырасла на 62 проц. У металаапрацоўчай прамысловасці БССР энергаўзброенасць працы павялічылася за перыяд другой пяцігодкі на 60 проц., а выпрацоўка аднаго рабочага адпаведна на 70 проц. У хімічнай прамысловасці БССР тэмп росту выпрацоўкі аднаго рабочага на 25 процантаў абганяў тэмп росту энергаўзброенасці. Тое-ж назіраецца і ў радзе іншых галін. У харчовай прамысловасці: пры росце энергаўзброенасці працы на 28,5 проц., а электраўзброенасці на 37 проц. выпрацоўка аднаго рабочага павысілася на 57 проц.

У запалкавай прамысловасці пры росце электраўзброенасці працы на 26 проц. выпрацоўка аднаго рабочага павялічылася на 83 проц. У скураназбутковай прамысловасці электраўзброенасць вырасла на 30—40 процантаў, а прадукцыйнасць працы — на 65—75 проц. У папяровай прамысловасці — адпаведна — 44 і 84 процанты, і т. д.

За першыя два годы трэцяй пяцігодкі прадукцыйнасць працы ў прамысловасці БССР узрасла на 22 процанты. У 1940 годзе, у прыватнасці ў другой яго палавіне, прыкметна павысіўся тэмп росту прадукцыйнасці працы. У прамысловасці БССР у другой палавіне 1940 г. выпрацоўка аднаго рабочага павялічылася на 14 проц. Рашаючай асновай павышэння прадукцыйнасці працы, росту выпрацоўкі на аднаго рабочага з'явіліся мерапрыемствы партыі і ўрада па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны, пераходу на 8-гадзінны рабочы дзень і сямідзённы тыдзень.

Рост тэхнічнай узброенасці працы стварае ўмовы для эканоміі рабочай сілы ў працэсе вытворчасці. Палікі паказваюць, што калі-б аб'ём прадукцыі прамысловасці БССР у канцы другой пяцігодкі нам прыйшлося-б вырабіць пры фактычных нормах прадукцыйнасці працы 1932 года, то патрэбавалася-б амаль у паўтара раза павялічыць колькасць рабочых.

Адзначаная намі цесная сувязь паміж павышэннем энергаўзброенасці і прадукцыйнасці працы выражае эканамічную эфектыўнасць унядрэння і асваення новай тэхнікі. Аднак гэта эфектыўнасць з'яўляецца яшчэ далёка не дастатковай. Аналіз паказвае, што тэмпы росту асноўных вытворчых фондаў перавышаюць тэмпы росту прадукцыі; гэта сведчыць аб наяўнасці велізарных рэзерваў для далейшага росту прадукцыйнасці працы за лік максімальнага скарыстання асноўных фондаў. Тэмпы росту прадукцыйнасці працы прамысловасці БССР яшчэ недастаткова абганяюць тэмпы росту энергаўзброенасці. Пры гэтым у радзе галін ёсць нават значнае адставанне. Так, напрыклад, за годы другой пяцігодкі энергаўзброенасць працы торфазабываючай прамысловасці БССР узрасла ў 2,1 раза, электраўзброенасць — у 4,5 раза, а прадукцыйнасць працы пры гэтым павялічылася, прыкладна, у 2 разы. Па прамысловасці буматэрыялаў за гэты-ж перыяд энергаўзброенасць працы ўзрасла ў 3,1 раза, электраўзброенасць— у 3,2 раза, а прадукцыйнасць працы—усяго толькі ў 1,7 раза. Падобныя прыклады паказваюць, што наша ўзросшая тэхніка яшчэ недастаткова скарыстоўваецца для павышэння прадукцыйнасці працы.

Аналіз канкрэтных матэрыялаў паказвае наяўнасць велізарнейшых рэзерваў для павышэння прадукцыйнасці працы за лік лепшага скарыстання тэхнікі.

Зробленыя намі арыентыровачныя падлікі паказалі, што з-за прастояў, выключна залежачых ад арганізацыі працы і ўнутрызаводскага планіравання, у радзе галін прамысловасці трацілася каля 10 проц. вытворчай магутнасці прадпрыемстваў. Так, напрыклад, у торфазабываючай прамысловасці сістэмы Наркамата мясцовай паліўнай прамысловасці каэфіцыент скарыстання рабочага часу абсталявання ў 1939 годзе склаў па асобных спосабах здабычы ад 0,74 да 0,78 проц. а па гідраэлеватарнаму спосабу ўсяго толькі 0,66. Народная гаспадарка страціла з-за гэтага дзесяткі тысяч тон торфу, што роўна вытворчай магутнасці тарфянога завода сярэдніх памераў. Ліквідацыя гэтых-жа «арганізацыйных» прастояў у Мінскім трэсце будаўнічых матэрыялаў у 1940 годзе дала-б такі-ж эфект, як, прыкладна, работа на працягу года вялікага цагельнага завода з вытворчай праграмай у 12 мільёнаў штук цэглы.

Ліквідацыя прастояў лесапільных рам з-за неналаджанасці рамонту і незадавальняючай пастаноўкі ўнутрызаводскага планіравання магла-б даць краіне дадаткова 13 тысяч кубаметраў піламатэрыялаў. У нас ёсць велізарныя рэзервы росту прадукцыйнасці машын за лік падцягвання адстаючых агрэгатаў і павышэння інтэнсіфікацыі скарыстання абсталявання. Павышэнне прадукцыйнасці адстаючых агрэгатаў магло-б даць дадаткова нямала прадукцыі.

Важнейшай умовай павышэння ступені скарыстання абсталявання з'яўляецца паляпшэнне арганізацыі працы і расстаноўкі рабочай сілы ў адпаведнасці з патрабаваннямі правільна арганізаванага тэхналагічнага працэса, унядрэнне матэрыяльнага заахвочвання ў аплаце працы, паслядоўнае ўнядрэнне тэхнічнага нарміравання ў вытворчасці, у прыватнасці на дапаможных і абслугоўваючых работах.

Павышэнне эканамічнай эфектыўнасці асваення сацыялістычнай тэхнікі неразрыўна звязана з задачай паляпшэння якасці прадукцыі, з выкананнем планаў па сортнасці, з максімальным скарачэннем страт ад браку ў вытворчасці. Аналіз паказвае, што ў нашай прамысловасці ўсё яшчэ не выконваюцца планы па сортнасці прадукцыі і побач з гэтым маюць месца вялікія страты з-за выпуску браку. Так, напрыклад, па мапстанкатрэсту страты ад браку ў мінулым годзе склалі суму звыш 800 тыс. рублёў.

Ліквідацыя страт з'яўляецца надзвычайна істотным фактарам паляпшэння эканомікі прадпрыемстваў, павышэння эфектыўнасці тэхнічнага ўзбраення. Для гэтага патрабуецца паладзіць планава-папераджальны рамонт і інструментальную гаспадарку, палепшыць унутрызаводскае, у прыватнасці міжцэхавае, планіраванне; прапавать чотка па графіку, ліквідаваць рыўкі і штурмаўшчыну ў рабоце, якія не толькі вядуць да прастояў, але і дачасна амартызіруюць абсталяванне.

Паляпшэнне скарыстання абсталявання патрабуе няспыннага ўнядрэння ў вытворчасць дасягненняў стаханаўцаў, стаханаўскіх метадаў працы. Разам з тым неабходна, як указаў тав. Маленкоў у сваім даклазе на XVIII партыйнай канферэнцыі, скарыстоўваць нашы высокапрадукцыйныя складаныя агрэгаты па іх наэначэнню з поўнай нагрузкай.

Неабходна карэнным чынам палепшыць планіраванне і ўлік скарыстання абсталявання ў нашых наркаматах, а асабліва ў Дзяржплане і Упраўленні народнагаспадарчага ўчота БССР.

Страты на прадукцыйнасці, таксама як і наогул страты на вытворчасці, чужды сацыялістычнай планавай гаспадарцы. Наадварот, законам сацыялістычнай эканомікі з'яўляецца прагрэсіўны рост прадукцыйнасці ўсёй грамадскай працы.

XVIII канферэнцыя ВКП(б) намеціла канкрэтныя шляхі поўнага скарыстання наяўных у народнай гаспадарцы велізарных рэзерваў.

Работа па-новаму, кіраўніцтва прамысловасцю і транспартам у адпаведнасці з рашэннямі XVIII партканферэнцыі забяспечаць не толькі выкананне, але і перавыкананне планаў 1941 года і трэцяй пяцігодкі, уздым усёй народнай гаспадаркі на новую, яшчэ больш высокую ступень.

Б. БЕНЦМАН.

загадчык кафедры народна-гаспадарчага планіравання Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імені В. В. Куйбышэва.

АПІРАЮЧЫСЯ НА ШЫРОКІ ПАРТЫЙНЫ АКТЫЎ

Практыка работы партыйных арганізацый Баранавіцкай абласці паказала, што там, дзе партыйныя кіраўнікі смела апіраюцца ў сваёй рабоце на шырокі партыйны актыў, там дасягнуты пладатворныя і эфектыўныя рэзультаты.

Станоўчых рэзультатаў у рабоце з партыйным актывам дабіўся Баранавіцкі гарком партыі. Ён узяў правільны курс на шырокае прыцягненне да правядзімай арганізацыйнай і прапагандысцкай работы членаў пленума і актывістаў первічных партыйных арганізацый. Гэта мае вылікае выхаваўчае значэнне. Людзі растуць на рабоце і разам з тым дапамагаюць партыйнаму апарату своечасова выконваць усю яго складаную работу, даводзіць партыйныя рашэнні да сазнання комуністаў і кантраляваць іх выкананне.

Член пленума гаркома і член партыйнага бюро паравознага дэпо Баранавічы тав. Слівінскі прымае актыўны ўдзел у жыцці гаракой партыйнай арганізацыі. Ён часта выконвае розныя даручэнні, падрыхтоўвае пытанні да партыйных сходаў.

Тав. Слівінскі на вытворчасці паказвае высокія ўзоры стаханаўскай працы. Ён шматныстакрываносавец. Ва ўмовах суровай зімы ён сістэматычна вазіў паязды цяжкай вагі, даваў высокую тэхнічную скорасць і эканоміў дзесяткі тон паліва. Пасля XVIII партканферэнцыі ён заключыў гарантыйны дагавор з комплексным брыгадай тав Скопа на лепшы рамонт паравоза і дагляд яго.

З вялікай запікаўленасцю выконвае партыйныя даручэнні член пленума тав. Фралоў. У час выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных ён быў прыкамандаван да 10-га выбарчага ўчастка для арганізацыі агітацыйна-масавай работы. Тут ён праявіў сябе як растучы і здольны работнік. Зараз па заданнях гаркома ён сістэматычна наведвае многія первічныя партыйныя арганізацыі горада.

Перыядычна прыцягваецца да партыйнай работы член пленума тав Сапёлкін. Зараз ён рыхтуе для бюро гаркома партыі пытанне аб палітычным выхаванні кандыдатаў у члены ВКП(б) у партарганізацыі паравознага дэпо. Тав. Сапёлкін не толькі выконвае тое, што яму даручаюць работнікі гаркома, але глыбока цікавіцца партыйнай работай, уваходзіць ва ўсе пытанні партыйнага жыцця.

Для таго каб усебакова падрыхтоўваць пытанні да пасяджэнняў бюро гаркома КП(б)Б, арганінструктарскі адзел у радзе выпадкаў прыбягае да дапамогі партыйнага актыва. Напрыклад: днямі абмяркоўвалі работу гаракой канторы сувязі. Тут ёсць многа розных непаладкаў, але карціна была далёка яшчэ не поўнай і не ясная. Прымаць рашэнне нельга было. Гаркам накіраваў тулы групу комуністаў на чале з членам пленума тав. Грынглаз. Гэтая камісія ўскрыла прычыны дрэннай работы гаракой канторы сувязі і аказала яе кіраўніцтву практычную дапамогу па іх знішчэнню.

Гарадскі партыйны актыў часта прыцягваецца і да выканання іншых важных даручэнняў. Аднойчы первічная партыйная арганізацыя мясакамбіната парашыла на сваім прадпрыемстве правесці палітдзень. Рабочыя цікавіліся структурай пабудовы органаў Совецкай улады, пытаннямі міжнароднага становішча, бягучай палітыкі. Гаркам КП(б)Б у дапамогу партыйным арганізацыям паслаў групу адказных совецкіх работнікаў на чале з намеснікам старшыні выканкома гаракога Совета дэпутатаў працоўных тав Колатавым. Да палітдня добра падрыхтаваліся, і ён прайшоў цікава, пры вялікай актыўнасці рабочых мясакамбіната.

На жаль, так абстаяць справы далёка не ўсюды. Прывядзем для прыкладу Слонімскі райком КП(б)Б (сакратар тав. Астафʼеў). Тут яшчэ не навучыліся апіравацца на партыйны актыў, раіцца з ім, прыцягваць яго да штодзённай работы партыйнай арганізацыі.

У Слоніме пленумы райкома партыі праводзіліся з нарушэннем устаноўленых Статутам ВКП(б) тэрмінаў.

— Бачыце, работа захліснула, — гаварылі работнікі райкома. — Не падрыхтавалі матэрыялы... Прыйшлося пазней склікаць пленум.

Трэба сказаць, што Слонімскі райком КП(б)Б таксама не прыцягвае да партыйнай работы і членаў пленума. Роля многіх з іх, літаральна, зведзена толькі да ўзделу, прытым часта пасіўнага, у пасяджэннях пленумаў. Не дзіўна таму, што ў рэзультаце адсутнасці сур'ёзнай і клапатлівай работы актыў разгублен, многія члены пленума не апраўдваюць сябе на практычнай рабоце. Так, член пленума РК КП(б)Б тав. Капылаў знят з пасады загадчыка райза за запушчэнне ралу буйнейшых памылак у кіраўніцтве калгасным будаўніцтвам. Член пленума народны суддзя тав. Макарэнка прыцягнут да партыйнай адказнасці за неэтычныя паводзіны ў быту, нарушэнне элементарных правіл партыйнай дысцыпліны. Атрымаў партыйнае спагнанне і член пленума Глазко.

Не зжыта яшчэ практыка нарушэння прынцыпа калектыўнасці і ў рабоце Новагрудскага, Кароліцкага і іншых РК КП(б)Б. Ёсць факты, калі тут праводзяць пасяджэнні РК пры ўдзеле 3—4 членаў, прытым прымаюць на гэтых пасяджэннях рашэнні па прынцыповых пытаннях, нават па прыёму ў партыю.

Трэба ўказаць і на такі вялікі недахоп у рабоце асобных партыйных арганізацый, як ігнараванне намеснікаў сакратароў первічных партарганізацый. У партарганізацыях райспажыўсаюза і ўпоўаткамазага, Новамышскага раёна, на працягу некалькіх месяцаў не праводзілася ніякай работы. Сакратары гэтых партарганізацый паехалі ў адпачынак і не далі даручэнняў сваім намеснікам.

Апора на шырокі актыў, калектыўнасць партыйнага кіраўніцтва — важнейшыя пытанні ўзняцця арганізацыйна-партыйнай работы на ўзровень задач, пастаўленых XVIII канферэнцыяй ВКП(б).

А. Б. ГЕРЦОВІЧ,

заг. арганінструктарскага аддзела Баранавіцкага абкома КП(б)Б.

ПЕРАТВОРЫМ БАЛОТЫ У КВІТНЕЮЧЫЯ ПАЛІ І СЕНАЖАЦІ

РАКА ПАЦЯЧЭ ПА НОВАМУ РУСЛУ

МАГІЛЕЎ. (Кар. «Звязды»). У 1940 годзе калгасы Быхаўскага раёна правялі вялікія меліяратыўныя работы. 418 гектараў забалочаных зямель яны ператварылі ў пладародныя палі. На ўчастку ў 587 гектараў асушаных балот адраманта-вана 6 кілометраў асушальнай сеткі. Пачата рэгуліроўка ракі Грозы.

У пойме гэтай ракі на плошчы звыш 2 тысяч гектараў цягнецца непраходная дрыгва. Калгаснікі Глухаўскага, Студзянецкага і Гаразденцкага сельсоветаў рашылі гэты масіў алваяваць у балота. Але каб асушыць яго, патрэбна змяніць русла ракі. Справа нялёгкая, аднак калгаснікі не адступілі ад свайго рашэння і па металу ферганцаў энергічна ўзяліся за работу.

Усё мінулае лета да глыбокай восені працавалі яны на канале. Комсамольска-маладзёжныя брыгады выконвалі нормы на 240—250 процантаў. Пракапана каля 8 кілометраў новага русла ракі пры шырыні яе ў 8,5 метра і глыбіні ў 2 метры.

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб правядзенні меліяратыўных работ у Беларускай ССР выклікала новы вытворчы ўздым у калгасах. Усюды намячаюцца канкретныя мерапрыемствы па ажыццяўленню плана асушкі балот.

Калгаснікі аднаўшна рашылі прадаўжаць пачатую ў мінулым годзе работу і закончыць копку новага русла ракі Грозы. Для гэтага неабходна будзе выняць 97.282 кубаметры грунту. Работа будзе закончана ў гэтым годзе. Рака Гроза на працягу 20 кілометраў будзе працякаць па новаму руслу.

У сёлах Пінщчыны

ПІНСК. (Кар. «Звязды»). У сёлах і на хутарах Пінскай вобласці праходзяць многалюдныя сходы сялян. Калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі шырока абмяркоўваюць гістарычнае рашэнне СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб асушэнні балот у Беларускай ССР і намячаюць планы яго выканання.

Сяляне вёсак Вялікія і Малыя Арлы, Хорск Давід-Гарадоцкага раёна намецілі ў гэтым годзе асушыць не менш 115 гектараў балот і правесці паляпшэнне паверхоўнага стоку вады па плошчы ў 575 гектараў. Для гэтага імі будзе прарыта 7.534 метры новых канаў і адрамантавана 17 кілометраў старых каналаў і канаў.

Вялікія работы па асушэнню балот намецілі правесці сяляне Дубойскага сельсавета. Жабчыцкага раёна. У парадку падрыхтоўкі да меліяратыўных работ яны загатаўляюць драўляныя лапаты, кіркі і матыгі. Арганізуюцца меліяратыўныя брыгады.

Сяляне-аднаасобнікі вёсак Варадзевічы, Сухое і Дастаева Іванаўскага раёна разам з членамі сельгасарцелей «Чырвоная звязда», «17 верасня» і «1 мая» ў мінулым годзе пракапалі 1900 метраў канаў і адрамантавалі старыя прапяжэннем у 13 кілометраў.

Пры асушэнні балот калгаснікі будуць будаваць вадаёмы. Такія вадаёмы намячаюць пабудаваць у гэтым годзе калгаснікі сельгасарцелей «Чырвоная звязда» Застружскага сельсавета аб'ёмам у 4.600 кубаметраў, «Серп і молат» — аб'ёмам у 2.100 кубаметраў.

Раённыя зямельныя аддзелы прыступілі да складання тэхнічных праектаў па меліярацыі. Паўсямесна ідзе праверка захаванасці старога і падрыхтоўка новага меліяратыўнага інвентара. Для кіраўніцтва асушальнымі работамі на месцах будуць праведзены абласныя курсы меліяратараў. На іх будзе навучацца 40 калгаснікаў.

ХЛЕБАРОДНЫЯ МАСІВЫ

Нератоўка

Каля самага раённага цэнтра працякае вузенькая рэчка Нератоўка. Выцякае яна з Качай-балота і ўпадае ў раку Пціч. У радзе месц Нератоўка заброснела, зарасла аірам, кіяшамі, і нават човен блытаецца ў зараслях.

Згубіла хараставо сваё, серабрыстасць Нератоўка. А бывала-ж плыла яна шумная, люстраная, вясёлая. Толькі на сэрцы ў людзей рабілася пяжка і нявесела, калі чулі яны яе ўсплёскі. Яшчэ і цяпер, калі над лозамі дагарае дзень і чырвань сонца іграе ў водах Нератоўкі, Антону Аламавічу Чарнецкаму, старому сельскаму ўрачу, здаецца, што гэта чырванее кроў, а ўсплёскі хваль вельмі падобны на цяжкія ўсхліпы людзей-грабароў.

Дык чаму-ж такія цяжкія адчуванні звязаны з успамінам, чаму гэту вузенькую рэчку назвалі Нератоўкай? Гэта рэчка ўтварылася не па волі прыроды, а пракладзена рукамі людзей, рукамі панскіх нявольнікаў.

— Было гэта задоўга да рэволюцыі, — расказвае Антон Адамавіч Чарнецкі, самы стары жыхар раённага цэнтра. — Тут, дзе зараз райком партыі, МТС і іншыя раённыя арганізацыі, быў маёнтак памешчыка Лапы. Пад яго ўладаннем былі вёскі Карпілаўка, Лоўсткі, Кавалі, Чырвоная Дуброва і інш. Рашыў Лапа асушыць балота. Загадаў сваім парабкам пачаць копку канала з Качай-балота. Уся работа праводзілася прымітыўным спосабам. У людзей не было добрых лапат, меліяратыўных інструментаў. Босыя, галодныя, яны боўталіся па пояс у вадзе, прастуджваліся, паміралі. Іх закапвалі тут-жа, на ўзбяражжы канала. 6—7 год капалі канал. 28 кілометраў пракапалі. А колькі загінула людзей, колькі поту, крыві і слёз праліта!

Як рыбы ў нераце, біліся і задыхаліся панскія нявольнікі-грабары і паміралі, не адчуўшы асалоды ад сваёй рабскай працы, не ўбачыўшы светлых дзён, не ўдыхнуўшы арамату асушаных лугоў, не ўчуўшы шэлесту каласоў на асвоеных землях, не паспытаўшы смаку свайго хлеба.

Так страшна нарадзілася рэчка, і назвалі яе Нератоўкай. Так асушаліся панскія балоты рукамі прапоўных.

Знойдзены клад

Па прыкладу любаньцаў на балота першымі ў раёне выйшлі калгасы «Чырвоная Арэса», «Культура», «Беларуская вёска», «Новы свет»... Калгасных грабароў узброілі патрэбнымі меліяратыўнымі інструментамі, абсталяваннем, транспартнымі сродкамі Натхнёныя ініцыятывай ферганцаў, калгаснікі дружным, з'еднаным фронтам пайшлі ў наступленне на адвечную багну — крыніцу малярыі, гнілога паветра і бядоты. Зашумела, закіпела работа. Праз імпыстыя балоты паляцелі роўныя стрэлы каналаў.

...А ў гэты-ж час на кавалках палепшаных сенажацей трубой выкручваліся сакавітыя травы, на асвоеных кавалках балот шумелі рослыя сінія аўсы, лапушылася і зацвітала маладчавая бульба, шумела бурачнае бацвінне, і гэта яшчэ больш паддавала ахвоты і сілы грабарам, яшчэ з большым энтузіязмам і шчырасцю яны расцярэблівалі хмызнякі, метр за метрам, кілометр за кілометрам пракладалі каналы. У 1940 годзе ў раёне было асвоена 1.266 гектараў балот і праведзена залужэнне на плошчы ў 1.126 гектараў.

Сярэдні ўраджай зернавых па раёну па асвоеных балотах быў 18,2 цэнтнера і бульбы — 187 цэнтнераў з гектара.

У адным толькі калгасе «Чырвоная Арэса» за 1938—40 гг. асушана 450 гектараў балота, з якіх асвоен 401 гектар. У калгасе «Культура» за 1939—40 гг. асушана 519 гектараў, асвоена 410 гектараў, залужэнне праведзена на плошчы ў 118 гектараў.

Сярэдні ўраджай зернавых і тэхнічных культур у калгасе «Чырвоная Арэса» складае: ячменю 24 цэнтнеры, аўса 29,9 цэнтнера, пшаніцы 18,5 цэнтнера, проса 22 цэнтнеры з гектара. Не меншы ўраджай і ў калгасах «Культура», «Новы свет», «Казбек».

— На балотах мы знайшлі клад, — гаворыць старшыня калгаса «Новы свет» тав. Покуш. — Балота нас на ногі паднімае, азалачвае.

Перспектыва

У Акцябрскім раёне яшчэ больш 18 тысяч гектараў неасушаных балот. Па плану абліза калгасам раёна патрэбна асушыць у гэтым годзе тысячу гектараў балот.

Калгаснікі-ж на сваіх людных сходах, абмяркоўваючы пастанову партыі і ўрада аб асушэнні і асваенні балот у рэспубліцы, абавязаліся больш чым удвая перавыканаць намечаны план асушэння балот. Па патрабаванню калгаснікаў райком партыі і выканком райсавета прынялі наступны план асушэння і асваення балот у 1941 годзе:

Асушыць — 2.500 гектараў.

Правесці магістральных каналаў — 8 кілометраў.

Зрабіць адвод паверхоўных вод на плошчы ў 600 гектараў.

Расчысціць ад пнёў і мелкалесся — 450 гектараў.

Падняць цаліны (ворыва) — 1.500 гектараў.

Пасеяць зернавых і тэхнічных культур — 1.831 гектар.

Правесці залужэнне на плошчы 300 гектараў.

Правесці праспейшае палепшанне лугоў і пасбішч — 300 гектараў.

Каб выканаць намечаны план, калгаснікі раёна цэлымі звеннямі, брыгадамі вышлі на расчыстку кустоў. У некаторых калгасах, як напрыклад «Культура», «Чырвоная Арэса», «Казбек», ужо ачышчана ад хмызнякоў плошча ў 60—80 гектараў.

Калгасы вылучаюць брыгады грабароў, рыхтуюць рыдлёўкі, тапары, шнуры, коллі.

Дружная і дзелавая падрыхтоўка да меліяратыўных работ ярчэй слоў гаворыць аб тым, што калгаснікі добра зразумелі велізарнае народнагаспадарчае значэнне гістарычнай пастановы партыі і ўрада аб асушэнні і асваенні балот, пераканаліся, што асвоенае балота — крыніца багацця, добрабыту і культуры.

А. ПЯТРОВІЧ.

Акцябрскі раён,
Палеская вобласць.

ЗЛАДЖАНАСЦЬ У РАБОЦЕ ЎСІХ ЗВЕННЯЎ ПРАДПРЫЕМСТВА — НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ВЫТВОРЧАЙ КУЛЬТУРЫ

★

Мінская швейная фабрыка імені Крупскай — адно з перадавых прадпрыемстваў у сістэме Белшвейтрэста. З пачатку новага года фабрыка з дня ў дзень выконвае вытворчы план, вядзе барацьбу за роўную, рытмічную і зладжаную работу ўсіх звенняў вытворчасці.

Рашэнні XVIII партканферэнцыі натхняюць калектыў фабрыкі на высокапрадукцыйную работу.

На прадпрыемстве разгарнулася зараз барацьба за ўзорную дысцыпліну, за палепшанне планіравання і ўліку, за строгае захаванне тэхналагічнага рэжыма, за высокую вытворчую культуру.

Ніжэй мы публікуем выступленні некаторых работнікаў фабрыкі, у якіх яны расказваюць, як калектыў прыступіў да рэалізацыі рашэнняў XVIII партканферэнцыі.

★ ★ ★

Кельга рытмічна працаваць на няспраўных машынах

Наша швейная фабрыка аснашчана навейшым абсталяваннем. У 1940 годзе на ёй упершыню ў Беларусі былі ўстаноўлены два новыя механічныя канвейеры. Старыя машыны 31 класа заменены новымі быстраходнымі машынамі 61 класа, якія даюць больш 3000 абаротаў у мінуту. Такіх машын у нас 80. Усе машыны асвоены і даюць высокую прадукцыйнасць — на 15 проц. вышэй старых.

Нашы работніцы палюбілі работу на канвейеры і працуюць з вялікай ахвотай. Культура вытворчасці ў нас стала больш высокай, палепшылася якасць.

У нас раней не быў арганізаван дастатковы догляд за новым абсталяваннем. Алсутнічаў планава-папераджальны рамонт. Машыны рамантаваліся ад выпадку да выпадку. Часта машыну адпраўлялі на рамонт тады, калі яна выходзіла са строю. Рамонт-жа, які праводзіўся ў цэху па выходных днях, не даваў належнага эфекта. Усе дэталі падганяліся наспех, іншыя зусім аставаліся непадагнанымі. Пасля такіх «рамонтаў» былі вялікія прастоі, што адмоўна адбівалася на выкананні вытворчай праграмы.

Перад адміністрацыяй фабрыкі было пастаўлена пытанне аб увядзенні планава-папераджальнага рамонту абсталявання, бо рытмічнасць і зладжанасць у рабоце ўсіх звенняў больш за ўсё залежаць ад спраўнасці машын. Разам з гэтым была распрацавана прэміяльна-дзельная сістэма аплаты працы механікаў, якая звязвала да наступнага: пры выкананні планава-папераджальнага рамонту машыны з адпаўкай «выдатна» налічваецца поўны процант прэміяльнай аплаты. Прэмія налічваецца таксама пры скарачэнні тэхнічных прастояў. Дзякуючы ўвядзенню гэтых мерапрыемстваў мы дабіліся скарачэння тэхнічных прастояў да 368 гадзін замест 2.510 гадзін да ўвядзення планава-папераджальнага рамонту.

Такое рэзкае скарачэнне прастояў з'явілася рэзультатам таго, што механік, ведаючы загадзя, якую машыну ён павінен зняць на рамонт, падрыхтоўвае адпаведную рэзервную машыну.

Няхрэпна мы змагаліся ў мінулым годзе і за эканомію электраэнергіі. Намі зэканомлена за 1940 год 59 тысяч кілават-гадзін. Гэтай эканоміі мы дабіліся шляхам замены недагружаных матораў вялікай магутнасці маторамі меншай магутнасці, з таксама дзякуючы своечасовасму выключэнню непатрэбнага асвятлення і сілавой нагрузкі. Рэгулярна мы чысцілі, змазвалі электраматоры і праводзілі планава-папераджальны рамонт іх.

Наша механічная майстэрня асвоіла ў мінулым годзе выпуск запасных дэталей для рамонту машын і трансмісій. Выраблена дэталей на суму 15.206 рублёў.

Для паспяховай рэалізацыі рашэнняў XVIII партыйнай канферэнцыі нам трэба зрабіць яшчэ вельмі многа і перш за ўсё ўстанавіць строгі рэжым догляду за абсталяваннем, весці барацьбу за дакладнае захаванне графіка рамонтных работ, за ўтрыманне ў чыстаце рабочага месца.

А. КРАС,
галоўны механік.

Удасканальваем тэхналогію

Тэхнічная думка фабрыкі зараз накіравана на тое, каб удасканаліць тэхналагічны працэс. Без добра пабудаванай тэхналогіі нельга арганізаваць рытмічнай работы лінтэ, канвейера. Рытм адной аперацыі павінен адпавядаць рытму наступнай аперацыі.

На працягу мінулага года мы перагледзелі вельмі многа аперацый, бо ісчаўшая да гэтага года тэхналогія не садзейнічала далейшаму росту прадукцыйнасці працы і не давала магчымасці палепшыць якасць. Аперацыі былі ўзбуйнены і іх прыйшлося разбіваць на дзве, а часамі і на тры, вядома, улічваючы пры гэтым палепшанне якасці пашыву.

Вось, напрыклад, восьмая аперацыя. Яна была вельмі грамоздкая, і яе прыйшлося разбуйніць. Тэхналогія дазваляла гэта. З аперацыі была выключана строчка кажэткі, гэта функцыя была перадана другой работніцы. Яна выконвае строчку без асобых цяжкасцей за лік недагружанага рабочага часу. Зараз работа ў ленце пайшла больш арганізавана.

У палепшанні якасці работы вялікую ролю адыгрываюць у нас лекалы. На фабрыцы ёсць вопытная група, якая эгоіна распрацаваных стандартаў робіць лекалы для закройнага цэха. Якасць лекалаў цяпер стала значна лепшай. Мы ўстанавілі, што лекалы на каўняры, планкі і манжэты паступаюць не толькі ў закройны, але і пашывачныя цэхі. Гэта дае магчымасць самім работніцам правяраць вырабы, не дапускаць адхілення ад стандарта. Нашы прыёмшчыцы забяспечаны табельмерамі (таблицы з указаннямі памераў асобных дэталей і гатовых вырабаў). Табельмеры мы ўвялі ўжо ў студзені 1941 г. Такі кантроль садзейнічае захаванню тэхналагічнага рэжыма. Прыёмшчыцы ў нас таксама сочаць за якасцю строчкі і велічынёй сцяжкоў. У выніку праведзеных мерапрыемстваў у нас заметна палепшылася якасць прадукцыі. Мы даем 98 проц. вырабаў першага сорту замест запланіраваных 94 проц.

Нядрэнна ў нас працуе тэхнічны кабінет. Ён стаў своеасаблівай школай абучэння новых рабочых. Новая работніца, перш чым прыступіць да работы, праходзіць курс абучэння ў тэхнічным кабінеце, знаёміцца з той аперацыяй, з той работай, на якую яна будзе пастаўлена. Навічкі знаёмяцца з машынамі, вучацца змазваць механізмы і набываюць некаторыя навыкі ў рабоце. Прыйшоўшы ў цэх, яны з першага дня сядзяцца за машыну і працуюць самастойна.

Вялікім недахопам у рабоце з'яўляецца тое, што мы не маем магчымасці правяраць якасць тэкстылю, які паступае да нас з іншых фабрык. У нас няма патрэбнага склада. Калі будзе пабудаван фабрычны склад, тады мы будзем праводзіць старанную праверку тэкстылю. Гэта намнога павысіць сортнасць нашай прадукцыі.

Ф. КАЦНЕЛЬСОН,
тэхнолаг.

Працуем планамерна, без рыўкоў

Наша фабрыка ў мінулым годзе выканала вытворчую праграму на 116,2 проц. Гэтыя поспехі дасягнуты дзякуючы таму, што калектыў фабрыкі правёў вялікую работу па механізацыі ўсіх вытворчых працэсаў. У 1940 годзе ўстаноўлены два механічныя канвейеры, прадукцыйнасць якіх на 15 проц. вышэй звычайных лент. Механічны канвейер дысцыплініруе працу рабочага, спрыяе больш рытмічнай, планамернай рабоце.

Але будзе няверным лічыць, што на механічным канвейеры ўсё пойдзе самапёкам. Планіраванне і тут мае вялікае значэнне. Варта толькі замарудзіць ход канвейера, як выпуск прадукцыі зменшыцца. Тут трэба ўсё ўлічваць, асабліва расстаноўку людзей. Вялікую ролю адыгрывае першая рука — запускальшчыца. Калі яна менш запусціць адзінак, то гэтым можа затармазіць работу ўсіх працуючых ля гэтай ленты.

Арганізацыі больш рытмічнай работы канвейера нам удалося дасягнуць шляхам удасканалення тэхналатічнага працэса. Нашы інжынерна-тэхнічныя работнікі перагледзелі тэхналогію і ва многім яе выправілі. Больш грамоздкія аперацыі разбуйнены. Ва многіх выпадках мы ліквідавалі разбежку ў часе выканання аперацый. Калі раней бывалі частыя выпадкі, што ля канвейера не ўсе былі аднолькава нагружаны і гэтым затрымлівалася работа, то зараз такіх выпадкаў у нас значна менш. Адхіленні ад рытму даведзены да 5 проц. на механічным канвейеры і да 10 проц. у астатніх цэхах.

Што датычыць планіравання ўнутры фабрыкі, то ў нас яно спрашчаецца тым, што паміж цэхамі няма тэхналагічнай сувязі. Кожны цэх дае закончаную прадукцыю, але і ў гэтым выпадку трэба чотка планіраваць работу кожнага цэха, змены, брыгады па асартыменту, улічваючы пры гэтым магутнасць лент, кваліфікацыю рабочых, іх навыкі, прыстасаванасць да вырабу таго ці іншага віду прадукцыі.

Прыходзіцца адзначыць, што не заўсёды ўдаецца нам скласці і давесці планы да цэхаў. У гэтым вінават Белшвейтрэст. Асартыментную праграму на першы квартал 1941 года ён нам прыслаў 7 студзеня. Ліміт заработнай платы рабочых мяняўся тры разы, фонд для малодшага абслугоўваючага персанала — 4 разы. Фабрыка падрыхтавалася да выпуску аднаго віду асартымента, а трэст прыслаў іншае заданне. Першы квартал ужо на выходзе, а мы не атрымалі ліміта на зніжэнне сабекошту.

Натуральна, што пры такіх умовах цяжка было своечасова планіраваць і забяспечыць выкананне графіка. Паміж лічбамі выканання студзеньскага і лютаўскага планаў ёсць усё-ж разыходжанне, хоць планы мы перавыканалі. У студзені мы далі 110,8 проц., а ў лютым — 101,1 проц.

Больш планамернай работы мы дабіліся ў сакавіку. Графік выконваецца раўнамерна, без скачкоў. План штодзённа перавыконваем на 5—6 процантаў.

І. ГАЛЬПЕРЫН,
начальнік планава-вытворчага аддзела фабрыкі.

Не спыняцца на дасягнутым

Мінская швейная фабрыка імені Крупскай пасляхова завяршыла 1940 гаспадарчы год. Яна выканала вытворчую праграму на 116,7 проц.

Рэалізуючы рашэнні XVIII партыйнай канферэнцыі, фабрыка дабілася больш планамернай, рытмічнай работы цэхаў і брыгад. Гэтых поспехаў калектыў дасягнуў дзякуючы механізацыі працэсаў работы і ўдасканаленню тэхналагічнага працэса.

Але на гэтым нельга супакойвацца. Перад кіраўніцтвам фабрыкі і стахановамі стаяць вялікія задачы па далейшаму павышэнню прадукцыйнасці працы. Фабрыка мае ў гэтых адносінах велізарныя рэзервы. Новыя машыны 61 класа могуць даць 3.500 абаротаў у мінуту, але гэта магутнасць яшчэ не асвоена. Колькасць абаротаў зараз ледзь дасягае 2.000 у мінуту.

Яшчэ няма і належнай чыстаты ў цэхах і на дварэ фабрыкі. Нават у цэхах, дзе ўстаноўлены механічныя канвейеры, парадка можна заўважыць на паллозе кавалкі тэкстылю, а часам і гатовую прадукцыю. Не чыста мыецца падлога.

Партыйная арганізацыя павінна поўнасцю ажыццяўляць правы кантролю дзейнасці адміністрацыі, глыбей уваходзіць у эканоміку вытворчасці.

Цікава прывесці такі прыклад. У снежні мінулага года на фабрыцы быў створан кароткатэрміновы семінар для партыйнага і гаспадарчага актыва па пытанню эканомікі вытворчасці. Слухачы праўлялі вялікую цікавасць да пытанняў планіравання, рэнтабельнасці, калькуляцыі, сабекошту прадукцыі і ўліку. Але чамусьці заняткі семінара спыніліся. Неабходна аднавіць работу семінара.

Калектыў фабрыкі, які мае добры вопыт работы і велізарныя рэзервы, безумоўна, не можа спыняцца на дасягнутым.

Дзіўную пазіцыю заняў Белшвейтрэст (кіраўнік т. Чолах). Кіраўніцтва трэста не змагло да гэтага часу перанесці вопыт лепшых прадпрыемстваў на ўсе швейныя фабрыкі Беларусі. Зусім недапушчальна такое з'явішча, калі большасць швейных фабрык працуюць па-старынны, яшчэ не маюць механічных канвейераў. Між тым, як паказвае вопыт работы фабрыкі імені Крупскай, механічны канвейер павышае прадукцыйнасць працы, паляпшае якасць выпускаемай прадукцыі, дае магчымасць працаваць дакладна па графіку і т. д. Канвейер павінен заняць пачотнае месца на ўсіх швейных фабрыках Беларускай ССР.

Г. БЛЮМКІНА.

Унядраць механізацыю ў швейную прамысловасць Беларусі

Швейная прамысловасць Беларусі за гады сталінскіх пяцігодак стала непазнавальнай: яна тэхнічна ўзбагацілася, выхавала новыя выдатныя кадры людзей — стахановаў-рацыяналізатараў, авалодаўшых тэхнікай і паказваючых узоры высокай прадукцыйнасці працы. Уведзена ў вытворчасць навейшае абсталяванне, што дало магчымасць павялічыць выпуск прадукцыі, палепшыць яе якасць.

Многія працэсы механізіраваны. Вось, напрыклад, прышыўка пуцікаў раней рабілася рукамі. Зараз устаноўленая на фабрыках 71 гуёкавая машына механізіравала ручную працу. Механізавана апрацоўка закрэпак у кішэнях. 160 машын замянілі ручную працу пры сцёжцы лапчанаў падвараўнікоў. Устаноўлены двухігольныя машыны для вырабу бялізны. Механізавана апрацоўка пецель для засцёжкі і т. д.

Замест машын 31 класа, якія даюць 2.200 абаротаў у мінуту, устаноўлены быстраходныя машыны 96 і 61 класа, якія даюць 3.500 абаротаў у мінуту. На новых быстраходных машынах прадукцыйнасць працы павялічылася на 15 процантаў.

На ўсіх фабрыках ёсць спецыяльныя лінейкі з рэжучым апаратам для абразкі канцоў насцілу. Работа гэта раней рабілася рукамі, пры дапамозе нажніц, і часта выклікала траўмы ў рабочых, апрача таго заўсёды атрымліваўся зігзагападобны адрэз. Зараз гэты недахоп ліквідаван. Дзякуючы ўвядзенню рэжучага апарата гадавая эканомія на матэрыяле складае каля 1.500 тыс. рублёў.

Асабліва вялікую ролю ў швейнай вытворчасці адыгрываюць прыстасаванні. Прымяняючы іх, можна намнога скараціць падрыхтоўчыя работы і тым самым павялічыць скарыстанне машыннага абсталявання.

Прыстасаванні адыгрываюць пэўную ролю і ў павышэнні якасці прадукцыі. Вядома, што прымяненне лінеек, рубільнікаў не толькі павялічвае прадукцыйнасць машын, але і дае больш роўную строчку. На фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» т. Каган прапанаваў сігнальны апарат для вылаўлівання вузлоў з шоўку пры вышыўцы пятлі. Прыстасаванне гэта змяншае брак, прадухіляе паломку іглы.

Механік фабрыкі т. Гутэрман сканструіраваў спецыяльную лапку, якая дае магчымасць прышываць да брук гузікі на адной машыне. Раней гэта аперацыя рабілася на двух гузікавых машынах.

Прымяненне лапкі т. Гутэрмана дало магчымасць эканоміць штогод 8.500 рублёў. Аслабаніліся гузікавыя машыны, у якіх швейная прамысловасць адчувае вострую патрэбу.

На віцебскай швейнай фабрыцы «Профінтэрн» тт. Дэйч і Шпукаў устанавілі замкі для рэгулятара сцяжка. Пры наўнасці гэтага прыстасавання работніца не можа самавольна павялічваць даўжыню сцяжка. Прапанова гэта паляпшае якасць прадукцыі і прадухіляе магчымасць нарушэння тэхналагічнага працэса.

Аднак прыходзіцца адзначыць, што часта тыя ці іншыя прапановы па механізацыі ручной працы вельмі доўга апрабіруюцца, цэлыя годы праходзяць, пакуль іх ажыццёвяць на вытворчасці. Напрыклад, на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» на працягу некалькіх год без карысці стаіць станок для дружавання фірмачак; яго пад рознымі прадлогамі не ўводзяць у вытворчасць. Не ўстаноўлены маталкі для нітак, замкі для рэгулятара станка.

На мінскай фабрыцы «Кастрычнік» доўгі час сучраціўляюцца ўвядзенню машыны з абразальным апаратам, машыны для абразкі ваты.

Пытанні механізацыі павінны стаць у цэнтры ўвагі работнікаў швейнай прамысловасці. Для гэтага трэба арганізаваць пастаянны абмен вопытам паміж фабрыкамі не толькі Беларусі, але і Саюза. Трэба смела ўнядраць розныя тэхнічныя ўдасканаленні і прыстасаванні, якія даюць пэўны вытворчы і эканамічны эфект.

Выключнае значэнне набывае малая механізацыя, якая ў спалучэнні з стахановскімі метадамі работы адыгрывае велізарную ролю ў развіцці швейнай прамысловасці Беларусі.

Неабходна таксама арганізаваць на буйных швейных прадпрыемствах механічныя майстэрні, якія дапамогуць нашым рацыяналізатарам і вынаходнікам быстрэй эксперыментраваць і ўнядраць у вытворчасць каштоўныя прапановы.

С. НЕСЦЕРАЎ,
інспектар па рацыяналізацыі Белшвейтрэста.

Сталінскія лаўрэаты

Таленавіты сатырык

Лепшыя творы совецкай літаратуры прасякнуты высокімі ідэаламі народнасці, ідэаламі душэўнага хараства і жыццёвай праўды. У гэтых творах, народных па духу, рэалістычных па сутнасці, на першым месцы — ідэйная мэтанакіраванасць, мастацкая глыбіня ў раскрыцці характараў. У іх — філасофска абагуленае выражэнне мыслей, пачуццяў, імкненняў народа.

Творы Кандрата Крапівы адзначаны гэтымі высокімі якасцямі.

Крапіва — пісьменнік-большэвік. Ён, перш за ўсё, — сын свайго народа, грамадзянін сваёй краіны, актыўны ўдзельнік будаўніцтва сацыялізма.

У вялікім арсенале мастацкіх сродкаў пісьменніка віднае месца займае самая грозная зброя—смех. Добра валодаць гэтай зброяй, трымаць яе вострай, адточанай— не лёгкая справа. Даўно сказана, што смешнае забівае. Але для таго, каб гэта смешнае заўсёды трапляла ў цэль, заўсёды забівала, патрэбны вялікае майстэрства мастака, ідэйная пераконанасць, сіла і запал барацьбіта.

Бічуючы недахопы, высмейваючы парокі, выкрываючы ворагаў, паклёпнікаў, Крапіва ведае: у нашай краіне кіпіць творчае жыццё мільёнаў людзей, энергія і розум якіх накіроўваюцца комуністычнай партыяй на вялікія гістарычныя справы будаўніцтва новага свету. Як актыўны ўдзельнік гэтага будаўніцтва, пісьменнік зброяй мастацкага слова, зброяй сатыры дапамагае народу пазбавіцца ад усяго таго, што перашкаджае яго руху наперад.

Крапіва напісаў нямала сатырычных вершаў і баек. Але з найбольш яркай сілай сатырычны талент пісьменніка выявіўся ў яго камедыі «Хто смяецца апошнім».

На адным з спектакляў у Першым Беларускім драматычным тэатры нам давялося пачуць такую гутарку.

Ішла п'еса «Хто смяецца апошнім». На сцэне — Зёлкін і Зіна.

Адзін глядач звяртаецца да другога, паказваючы на Зёлкіна.

— Гэта ён!

— Адкуль вы яго ведаеце?

— Ён працаваў у нашай установе.

— А як яго прозвішча?

— Мухравецкі.

— Вось і памыліліся. Яго прозвішча Зёлкін.

— Сам ведаю, што Зёлкін. Але гэта пісьменнік яму даў такое прозвішча. А ў нашай установе ён быў Мухравецкім.

Сапраўды, чытаючы п'есу Крапівы ці бачачы спектакль, вы лумаеце — дзесьці вы сустракалі гэтага Зёлкіна — паклёпніка, шаптуна, падхаліма.

Гарлахвацкі — ярка выпісан драматургам. Гэта — трацкіст, школнік. Ён прабраўся на пасаду дырэктара навуковай установы пасля сваёй школніцкай дзейнасці ў наркамаце. Ён карыстаецца ўсімі сродкамі для таго, каб школзіць, ачарніць чэсных людзей, перабіць кадры. Зёлкін дапамагае яму ў гэтым.

Саркастычны, бічуючы смех ужывае драматург для выкрыцця гэтых людзішак.

Гэта п'еса Крапівы, як і іншыя яго творы, адзначана глыбокай партыйнасцю. Крапіва — тонкі мастак. Ён ведае жыццё, умее правільна ацэньваць жыццёвыя з'явы, іх узаемасувязь, логіку развіцця падзей. Вялікая нянавісць да ворагаў і гарачая любоў да народа дапамаглі мастаку праўдзіва выпісаць характары адмоўных і станоўчых герояў. Пісьменнік — не сузіральнік, не чалавек, які стаіць у баку ад падзей. Ён — іх удзельнік.

Вялікая ўдача драматурга — вобраз Тулягі. Гэты вучоны, чэсны работнік знаходзіцца ў вечным страху. Няўпэўненая паходка. Сполах ад кожнага стуку ў дзверы. Тулягу прынялі на вуліцы за былога дзенікінскага палкоўніка Палгаецкага. Гэта скарыстоўвае ў сваіх мэтах Гарлахвацкі. Шляхам запалохвання ён прымушае Тулягу напісаць за яго навуковую працу з тым, каб выдаць сябе за вялікага вучонага.

Але пад уплывам акружаючай рэчаіснасці, пры дапамозе чэсных совецкіх людзей, мужных барацьбітоў за праўду — Левановіча і Веры, Туляга ўсведамляе сваю годнасць совецкага грамадзяніна. Праўда — на баку Левановіча, Веры, на баку станоўчых герояў п'есы.

Вера гаворыць аб Левановічу:

«Вось, цёця Каця, маладыя хлапец, а хутка прафесарам будзе.

Цёця Каця. Цяпер-жа ўсе маладыя — разумныя, на тое-ж вас і вучаць.

Вера. І на чым-жа вырас! Па торфе.

Цёця Каця. Усюды растуць: на торфе, на гліне. На пяску і то растуць. Такі ўжо клімат у нас.

Вера. Добры клімат, цёця Каця, совецкі!»

Так, добры ў нас клімат, совецкі, сацыялістычны. І яго не могуць атруціць ніякія гарлахвацкія, зёлкіны і ім падобныя, колькі-б яны сіл да гэтага ні прыкладалі.

Пісьменнік знайшоў патрэбныя фарбы, трапныя характарыстыкі для сваіх герояў. Ён бязлітасна і злосна высмейвае гарлахвацкіх і зёлкіных. Паслухаць толькі «навуковую» прамову дворніка Нічыпара аб свіной касці, якую прывалок Цюлік і на якой хацеў набудаваць сваю вучоную кар'еру невук Гарлахвацкі!

«Хто смяецца апошнім» — балай лепшая сатырычная камедыя ў нашай драматургіі. Яе сіла ў праўдзівай, вострай і мужнай распрацоўцы тэмы, у яркай абрысоўцы характараў. Яе сіла ў тым, што дзея адбываецца ў совецкім асяроддзі і што ўдзельнікі яе — жывыя людзі, а не схемы.

Драматург уклаў у гэту п'есу страсць сваёй душы. Ён ведае, за каго і супроць каго ён выступае.

Мова п'есы вобразная, дахопчывая, яна зэе лёгкім юмарам і злой сатырай.

У п'есе і спектаклі апошнімі смяюцца станоўчыя героі — Левановіч, Вера, Чарнавус. І разам з імі апошнімі смяюцца чытачы і гледачы.

На дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве п'есы Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім» і «Партызаны» карысталіся велізарным поспехам у маскоўскага гледача.

П'еса «Хто смяецца апошнім» з вялікім поспехам ідзе ў Маскоўскім тэатры сатыры і ў іншых тэатрах Совецкага Саюза.

Кандрат Крапіва за п'есу «Хто смяецца апошнім» атрымаў высокую ўзнагароду — Сталінскую прэмію другой ступені.

Таленавіты пісьменнік-большэвік, ён узрадуе совецкага чытача яшчэ не адным яркім творам, дастойным нашай вялікай сталінскай эпохі.

С. КУНЯЎСКІ.

З А Р У Б Я Ж О М

Вайна ў Еўропе і Афрыцы

(Дзённік ваенных дзеянняў)

Асноўны ўдар германскай авіяцыі ў ноч на 20 сакавіка быў накіраван супроць сталіцы Англіі. У нападзе на Лондан прыняло ўдзел некалькі сот бамбардыроўшчыкаў. Германская авіяцыя, гаворыцца ў зводцы германскага камандавання, паслядоўнымі хвалямі на працяту шасці гадзін бамбардыравала докі Вікторыя, Сальберта і докі караля Георга V, а таксама партовыя збудаванні, размешчаныя ў раёне згібу Тэмзы.

Англійскія самалёты зрабілі ў ноч на 19 сакавіка інтэнсіўны налёт на горад Кіль і яго аколіцы. Бамбардыроўка горада працяваўжалася некалькі гадзін. У ноч на 20 сакавіка англійская авіяцыя бамбардыравала некаторыя пункты ў Заходняй Германіі.

На албанскім фронце італьянскія войскі прадпрынялі 19 сакавіка атакі мясцовага характару, якія не прывялі, аднак, да істотных змен. Наступальныя аперацыі італьянцаў у цэнтральным сектары фронта, адзначаецца ў камюніке вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі, падтрымаюцца танкавымі часцямі, а таксама атакі мясцовага характару ў паўночным сектары цэнтральнага фронта, былі адбіты. Адна італьянская рота, якая трапіла пад перакрыжаваны агонь аўтаматычнай зброі і артылерыі грэкаў, поўнасцю знішчана. Грэчаскія войскі, перадае салонікскі карэспандэнт югаслаўскай газеты «Політыка», прадпрынялі, у сваю чаргу, у галоўным сектары цэнтральнага фронта атаку, якая закончылася паспяхова. Афінскі карэспандэнт газеты «Політыка» паведамляе, што ў выніку наступлення грэкаў на цэнтральным фронце імі занята вышыня ў 1.500 метраў. На ўсім фронце прадаўжаецца ажыўленая артылерыйская перастрэлка.

***

У Паўночнай Афрыцы англійскія войскі зноў прабавалі наблізіцца да ўмацаваных пазіцый італьянцаў у аазісе Джарабуб, але былі рассеяны, як адзначаецца ў італьянскай зводцы, артылерыяй італьянцаў. Італьянскія самалёты бамбардыравалі паветраныя базы англічан у Берка (ля Бенгазі). Германскія паветраныя сілы атакавалі рад пазіцый і пабудоў англічан у Кірэнаіцы. У ноч на 19 сакавіка англійскія самалёты зрабілі налёт на Трыполі.

Ва ўсходняй Афрыцы, у Абісініі, італьянскія часці пасля эвакуацыі Джыг-Джыга аказваюць супраціўленне наступленню англічан ля перавала Марда (на ўсход ад Джыг-Джыга). Камментыруючы ўзяцце Джыг-Джыга, агенцтва Рэйтэр адзначае, што англійскія войскі, заняўшы гэты горад, перарэзалі тым самым шлях італьянцам, адступаючым ад Берберы (Брытанскае Самалі). У Паўночнай Абісініі, паводле камюніке англійскага камандавання на Бліжнім Усходзе, партызанскія часці ідуць у напрамку на Дэбра—Маркос.

Англійская авіяцыя актыўна падтрымлівае дзеянні англійскіх часцей у раёне Керэна. Англійскія самалёты падвергалі інтэнсіўнай бамбардыроўцы і абстрэлялі з кулямётаў войскі і артылерыйскія пазіцыі італьянцаў, размешчаныя на ўзгорках вакол горада. У Абісініі бамбардыроўшчыкі паўднёва-афрыканскай авіяцыі атакавалі з пікіруючага палёту абарончыя пазіцыі італьянцаў паблізу перавала Марда.

Каірскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, спасылаючыся на весткі, атрыманыя ў ваенных колах, што для завяршэння кампаніі ва Ўсходняй Афрыцы англічане сканцэнтравалі вялікую колькасць ваенных матэрыялаў і ўзбраення, у тым ліку некалькі сот атрыманых з Амерыкі самалётаў. Рашучае наступленне на Керэн будзе, па думцы карэспандэнта, прадпрынята адначасова з пасканэннем наступлення ў Абісініі. Большасць англійскіх лічыць, што, нават, калі ў бліжэйшы час пачнецца сезон веснавых дажджоў, англічане ўсё-ж зможуць прадаўжаць наступленне ўздоўж шасейных дарог, пабудаваных італьянцамі.

20 сакавіка. (ТАСС).

Амерыканская дапамога Англіі

НЬЮ-ЙОРК, 20 сакавіка. (ТАСС). Паводле паведамлення вашынгтонскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, марскі міністр ЗША Нокс у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што марское міністэрства мае намер перадаць Англіі лёгкія падводныя караблі, у тым ліку знішчальнікі падводных лодак, тарпедныя катэры і іншыя «маскітныя» судны. Паводле слоў Нокса, гэтыя караблі могуць быць скарыстаны Англіяй для барацьбы з караблямі праціўніка ў Ла-Маншы, а таксама могуць несці старажавую службу каля ўзбярэжжа. Ні адзін такі карабль яшчэ не перадан Англіі. Далей Нокс заявіў, што ў бліжэйшым будучым у ЗША паскоранымі тэмпамі будуць будавацца маскітныя судны, паколькі прамысловцы амаль закончылі падрыхтоўку да масавага выпуску іх. Нокс адмовіўся адказаць на пытанне аб магчымасці перадачы Англіі дадатковага ліку эсмінцаў. Нокс заявіў, што яму нічога невядома з поваду паведамленняў аб тым, што ЗША, магчыма, перададуць Англіі таксама крэйсеры. Англія, прадаўжаў Нокс, звярнулася да ЗША за дазволам скарыстаць амерыканскія ваенна-марскія верфі для рамонту пашкоджаных англійскіх караблёў. «Некаторае абсталяванне», указаў Нокс, можа быць скарыстана для рамонту англійскіх караблёў, аднак ЗША яшчэ не прынялі рашэння па поваду гэтай англійскай просьбы. Нокс паведаміў таксама, што палкоўнік Дановен у бліжэйшы час выступіць з прамовай, у якой раскажа аб сваіх уражаннях ад паездкі за мяжу. Як указвае карэспандэнт, Рузвельт 19 сакавіка прыняў Дановена.

АМЕРЫКАНСКАЯ ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ ПРЫНЯЛА ЗАКОНАПРАЕКТ АБ АСІГНАВАННІ 7 МЛРД. ДОЛАРАЎ НА АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ АНГЛІІ

НЬЮ-ЙОРК, 20 сакавіка. (ТАСС). Паводле паведамлення вашынгтонскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, палата прадстаўнікоў большасцю ў 336 супроць 55 галасоў прыняла законапраект аб асігнаванні 7 млрд. долараў на рэалізацыю праграмы, прадугледжанай законам аб перадачы ў арэнду або ў доўг узбраення. Законапраект быў прынят пасля пядоўгіх спрэчак. Як мяркуюць, новы законапраект будзе прынят сенатам у бліжэйшы час.

Эвакуацыя дзяцей з буйных прамысловых цэнтраў Германіі

БЕРЛІН, 20 сакавіка. (ТАСС). Германскі ўрад правёў шырокія мерапрыемствы па эвакуацыі дзяцей з буйных прамысловых цэнтраў Заходняй Германіі, а таксама з раёнаў Берліна, якія падвяргаюцца паветраным бамбардыроўкам. Дзеці накіраваны ва ўсходнія і паўднёвыя раёны Германіі—у пратэктарат, Аўстрыю і т. д. Як паведамляе газета «Гамбургер фрэмдэнблат», з Гамбурга эвакуіравана 30.598 дзяцей ва ўзросце ад 6 да 10 год і 28.370 дзяцей ва ўзросце ад 10 да 14 год. Дзеці з Гамбурга ў асноўным накіраваны ў Аўстрыю. Там зараз размешчана 30.696 дзяцей. У Саксоніі размешчана 18.800, у Верхняй Баварыі—4.765 і Вене—4.706 дзяцей. Разам з дзецьмі, як указвае газета, накіроўваюцца настаўнікі школ для таго, каб дзеці не прарывалі сваіх заняткаў у перыяд эвакуацыі. У прыватнасці, з Гамбурга разам з дзецьмі накіраваны 1.085 настаўнікаў. Эвакуацыя дзяцей з заходніх і паўночна-заходніх абласцей Германіі прадаўжаецца. Паводле паведамлення газеты «Франкфуртэр цэйтунг», у бліжэйшы час некалькі тысяч дзяцей будзе адпраўлена з паўночнай і заходняй абласцей Германіі ў Славакію. Дзеці будуць размешчаны ў пустуючых аталях і пансіёнах.

Сустрэча Ідэна з Сараджоглу

АНКАРА, 20 сакавіка. (ТАСС). Анаталійскае агенцтва перадае, што ўчора вечарам у Каіры было апублікавана наступнае камюніке: «Турэцкі і англійскі міністры замежных спраў сустрэліся 18 сакавіка. Яны абмеркавалі розныя міжнародныя пытанні, якія адбыліся з часу візіта Ідэна ў Анкару ў мінулым месяцы, і зноў канстатыравалі поўную ідэнтычнасць поглядаў, існуючых паміж урадамі Турцыі і Англіі».

Сустрэча адбылася на востраве Кіпр.

Высадка англійскіх войск у Салоніках

НЬЮ-ЙОРК, 20 сакавіка. (ТАСС). Як перадае белградскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, па вестках з Лёндэлі (грэка-югаслаўская граніца), у Салоніках высадзілася многа англійскіх войск. Туды-ж дастаўлены вялікія запасы бензіну.

Юнайтэд прэс аб згодзе Югаславіі далучыцца да пакта трох дзяржаў

НЬЮ-ЙОРК, 20 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе белградскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, югаслаўскі ўрад у ноце, адрасаванай Берліну, дае згоду на абмеркаванае далучэнне да пакта трох дзяржаў. Як мяркуюць, у бліжэйшы час германскі ўрад запросіць Цветковіча і Цынцар-Марковіча ў Берлін для падпісання пагаднення. Паводле паведамлення з паінфармаваных крыніц, гэта пагадненне прадугледжвае: 1) Германія гарантуе тэрытарыяльную цэласнасць Югаславіі; 2) усе краіны, падпісаўшыя пакт трох дзяржаў, у тым ліку Венгрыя, Румынія і Балгарыя, павінны паважаць гэту гарантыю; 3) Югаславія аслабаняецца ад ваенных абавязацельстваў па пакту трох дзяржаў; 4) пасля вайны Германія разгледзіць югаслаўскія дамаганні на выхад да Эгейскага мора. Дадатковае пагадненне прадугледжвае: 1) транзіт германскіх ваенных матэрыялаў і санітарных паездоў праз Югаславію; 2) эканамічнае супрацоўніцтва Югаславіі з Германіяй; 3) падаўдненне ў Югаславіі ўсіх элементаў, выступаючых супроць дзяржаў асі.

Уступленне грэчаскіх войск у Тэпелене

ЛОНДАН, 20 сакавіка. (ТАСС). Спецыяльны карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе з албанскай граніцы, што згодна атрыманых па граніцы вестак, перадавыя часці грэчаскіх войск пасля жорсткага бою сёння раніцой уступілі ў Тэпелене. Грэкамі ўзята ў палон многа італьянцаў і захоплена вялікая колькасць ваенных матэрыялаў.

Выдатнік вучобы Брэсцкай музыкальнай школы Ранальд Агадзкаў на ўроку. Фото В. Лупейкі. (БЕЛТА).

„ТРАВІЯТА"

(Да пастаноўкі ў Вялікім ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР)

Канвой для лібрэта оперы Вердзі «Травіята» паслужыў раман А. Дзюма (сына) «Дама з камеліямі». Гэтым раманам адкрываецца цэлы рад твораў, прысвечаных асвятленню праблем сацыяльнага жыцця буржуазнага грамадства 40-х гадоў XIX стагоддзя. Гэты перыяд часу ў Францыі адзначан канцэнтрацыяй велізарных багацяў краіны ў руках невялікай групы фінансавых заправіл і банкіраў і адначасова масавым разарэннем дробнай французскай буржуазіі, ростам дэкласіраваных элементаў. Буйная буржуазія, ахопленая прагай нажывы, адкрыта аглашае культ «асалод». Побач з так званым вышэйшым светам узнікае новы своеасаблівы свет шыкарных какотак, названых з лёгкай рукі Дзюма «поўсветам».

Праблема барацьбы з адкрытым маральным разлажэннем, з распустай пачынае хваляваць лепшых людзей Францыі.

Масавыя самазабойствы жанчын «поўсвета», іх цяжкае бяспраўнае становішча пабудзілі таленавітейшых пісьменнікаў таго часу — Дзюма, Бальзака, Флабера і іншых накіраваць астрыё свайго пяра ў абарону жанчын, сарваць фігавыя лісткі з буржуазнай «дабрачыннасці» і маралі.

Матывам для напісання «Дамы з камеліямі» паслужыла асабістая драма Дзюма. Малады паэт трапляе ў салон вядомай у той час прыгажуні поўсвету Мары Дзюплесі. Маладыя людзі пакахалі адзін аднаго, але бацька Дзюма, даведаўшыся аб гэтай сувязі, увозіць сына на доўгі час з Парыжа, пасля чаго, вярнуўшыся ў сталіцу, Дзюма-сын ужо не знаходзіць у жывых сваёй улюбёнай.

Велізарны грамадскі рэзананс, які мела «Дама з камеліямі», выклікаў цэнзурныя рэпрэсіі не толькі на радзіме Дзюма, але і за яе межамі. Кампазітар Вердзі, аблюбаваўшы гэты сюжэт, прымушан быў з цэнзурных меркаванняў перанесці час дзеяння на сто год назад, змяніць імёны дзеючых асоб і назву сваёй оперы, назваўшы яе «Травіята» (што па-італьянску азначае распусніца), гэтым загалоўкам нібы асуджаючы жанчын поўсвету. Але Вердзі-мастак падняў і апраўдаў сваю Віялету таксама, як Дзюма сваю Маргарыту Гоцье.

На працягу амаль стагоддзя нязменны поспех суправаджае гэты твор Вердзі. Шчырасць, эмацыянальнасць, усхваляванасць, драматургічная калізія, багацце мелодыкі, агульнадаступнасць музыкі—вось сакрэт вялікай папулярнасці оперы.

Пастаноўшчыкаў і акторaў заўсёды непакоіць пытанне, як рашаць вобраз Жэрмона—бацькі Альфрэда—гэтага носьбіта буржуазнай маралі, асноўнага віноўніка пагібелі Віялеты, бо мілагучнасць верадзіеўскай музыкі нібыта апраўдвае яго ўчынкі, робіць з яго «благароднага» папашу. Нам здавалася, што гэты момант нікольскі не супярэчыць сацыяльнай сутнасці вобраза Жэрмона, а нават падкрэслівае яе. Жаданне дабіцца згоды Віялеты на разрыў з сынам Альфрэдам выклікае ў Жэрмона яго медатачывасць, яго пераканаўчую пяшчотнасць, за якой схаваны капачыя кіпцюры зборшчыка податкаў.

Вялікі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР выпускае прэм'еру оперы «Травіята», над якой працуе пастановачная брыгада ў саставе: дырыжора заслужанага дзеяча мастацтваў БССР М. Э. Шнейдэрмана, пастаноўшчыка заслужанага артыста РСФСР І. Ю. Шлепянава, сумпастаноўшчыка В. М. Шахрай і мастака заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР М. М. Чэрэмных. Хоры разучаны заслужаным артыстам БССР А. А. Бельскім. У галоўных ролях заняты: Віялета — заслужаная артыстка БССР А. Ф. Аляксеева і Д. З. Ероз, Альфрэд Жэрмон—заслужаныя артысты БССР В. Ф. Лапін і І. М. Балоцін, Жорж Жэрмон—заслужаныя артысты БССР М. І. Дзянісаў і А. Д. Арсенка.

Рэжысер В. М. ШАХРАЙ.

Кінонарыс пра асушэнне балот

У сувязі з пастановаю СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб асушэнні балот у Беларускай ССР кіностудыя «Совецкая Беларусь» выпускае мастацка-папулярны кінанарыс «Вялікае наступленне», прысвечаны ўсенароднаму руху за асушэнне балот. Кінонарыс пакажа вопыт асушэння балот у калгасе імені БАВА, Любаньскага раёна, вынікі меліяратыўных работ.

На экраны рэспублікі фільм паступіць у канцы сакавіка. (БЕЛТА).

ЛЕКТОРЫЙ ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

У мінулым вучэбным семестры пры Дзяржаўным універсітэце (Мінск) створан лекторый. За прайшоўшы час тут прачытана дзесяць лекцый на грамадска-палітычныя, прыродазнаўчыя і геаграфічныя тэмы.

Бюро лекторыя распрацавала тэматыку лекцый на бліжэйшы час. Начнецца звыш 50 тэм. Важнейшыя з іх: «Узнікненне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы», «Ламаносаў — першы рускі хімік», «Культура краін старажытнага Двурэчча», «Дантэ і Петрарка», «Паходжанне і развіццё мовы», «Гарады пад зямлёй і пад вадой», «Белавежская пушча», «Навейшыя даследванні стратасферы», «Паходжанне зямлі».

У рабоце лекторыя прымаюць удзел на грамадскіх пачатках лепшыя прафесарска-выкладчыцкія сілы універсітэта — акадэмікі В. Н. Перцаў, Н. М. Нікольскі, Т. Н. Годнеў, прафесары М. Е. Макушок, І. А. Ветохін, Ф. Г. Осіпенка і іншыя.

Кожную нядзелю ў 8 гадзін вечара ў 313-й аўдыторыі біялагічнага корпуса універсітэта (Універсітэцкі гарадок) кожны грамадзянін мае магчымасць праслухаць цікавую лекцыю або даклад, узбагаціць свае веды, павысіць свой культурны і палітычны кругазор.

Выраб картона для IV выдання твораў В. І. Леніна

Картонная фабрыка імені 17 верасня, якая знаходзіцца каля мястэчка Краснае, Вілейскай вобласці (БССР), атрымала пачотны заказ на выраб картона для пераплётаў IV выдання твораў В. І. Леніна. Выпускаемы фабрыкай картон — глазіраваны — з'яўляецца высокаякасным. Увесь заказ — 1200 тон—павінен быць выраблен на працягу 10 месяцаў. Зараз калектыў фабрыкі эмагаецца за дагэтэрміновае выкананне пачотнага задання.

У Ленінград, у адрас манетнага двара ўжо адпраўлена каля 300 тон картона фабрыкі імені 17 верасня.

Сельскія аптэкі рыхтуюцца да вясны

Сельскія аптэкі рэспублікі рыхтуюцца да абслугоўвання калгаснікаў у час веснавых палявых работ. Змяняюцца гадзіны работы аптэк. У час пасеўнай кампаніі калгаснікі змогуць купляць лякарствы да выхаду ў поле і па сканчэнні работ. Для продажу медыкаментаў і прамеётаў санітарнай гігіены арганізуюцца выезды ў поле.

Звыш 22.000 калгасных аптэчак і каля 35 тысяч індывідуальных пакетаў паслана да веснавых работ у сельскія раёны рэспублікі.

Паведамленні

21 сакавіка, у 7 гадзін 30 мінут вечара, у зале Дома вучоных (Комуністычная, 17) адбудзецца лекцыя доктара эканамічных навук праф. т. Турэцкага (Дзяржплан СССР) на тэму **«Зніжэнне сабекошту як важнейшая эканамічная задача».**

Запрашаюцца партыйна-гаспадарчы актыў, навуковыя работнікі і прапагандысты.

АДДЗЕЛ ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ МІНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б.

Сёння ў памяшканні Дома партыйнай асветы (Вялікая зала) адбудзецца сход гарадскога комсамольскага актыва **па выніках XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі.** Даклядчык сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Зімянін.

Пачатак: у 7 г. 30 м. вечара. Білеты ў РК ЛКСМБ.

21 сакавіка ў парткабінеце Варашылаўскага РК КП(б)Б (Энгельса, 4) адбудзецца лекцыя на тэму **«Вучэнне Леніна—Сталіна аб комуністычнай маралі».** Лектар — загачык кафедрай марксізма-ленінізма Політэхнічнага інстытута тав. Топаз.

Пачатак у 8 гадзін вечара. Уваход свабодны.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

21 сакавіка

ДАРЭМНАЯ ПЕРАСЦЯРОГА

Пачатак у 8.30 вечара.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

21 сакавіка

ГЕНЕРАЛЬНЫ КОНСУЛ

Пачатак у 8 г. 30 м. вечара. Па калектыўных заяўках прадастаўляецца скідка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

21 сакавіка

А КРУМЕР ШЫДЭХ

Пачатак у 8 г. 30 м. вечара. Льготныя талоны сапраўдны да красавіка.

АКРУГОВЫ ТЭАТР ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ЗахАВА (Мінскі Дом Чырвонай Арміі) Гастролі Маскоўскага тэатра камедыі ЦДКА

21 сакавіка

«САДЫ ЦВЕТУТ»

Пачатак у 8.30 вечара.

МІНСКАМУ АЎТАРАМОНТНАМУ ЗАВОДУ

патрэбны:

СЛЕСАРЫ, КАВАЛІ ЗВАРШЧЫКІ, КЛЯПАЛЬШЧЫКІ І НЕКВАЛІФІКАВАНЫЯ РАБОЧЫЯ.

Звяртацца: Магілеўскае шасе, д. 8, тэлефон 23-866.

Дзяржаўны тэатр юнага гледача БССР імені Н. К. Крупскай (Памяшканне Палаца піонераў)

21 сакавіка

М. Светлоў.

КАЗКА

П'еса ў 4-х дзеях. Пачатак у 6 г. веч. Каса з 11 г. ран. да 6 г. веч. Прымаюцца калектыўныя заяўкі па тэл. 21-812.

Гэтымі днямі Прадзелкі Скапева

Кінатэатр «Чырвоная Зорка»

ВАЛЕРЫЙ ЧКАЛАЎ

Сеансы: 5.45, 7.30, 9.15 і 11 г. веч.

Кінатэатр «Радзіма»

КАНЦЭРТ-ВАЛЬС

Сеансы: 6.30, 7.45, 9.15 і 11 г. вечара.

Кінатэатр «Інтэрнацыянал»

ЛЮДЗІ НАШАГА КАЛГАСА

Дзіцячы кінатэатр

Дзённыя сеансы

САЛАВАТ ЮЛАЕЎ

Вячэрнія сеансы для дарослых

ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЕ

Кінатэатр «Навіны дня» (б. «Спартак»)

1. Родная кроў (навукова-папулярны фільм).
2. Пенаты (відавы кінанарыс).
3. Саюзкінажурнал №№ 22 і 23.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

22 і 23 сакавіка прэм'ера

ТРАВІЯТА

Опера ў 4 актах, музыка Вердзі.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЮРЫДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ

з 20 па 22 сакавіка г. г.

ПРАВОДЗІЦЬ НАВУКОВУЮ СЕСІЮ

НА СЕСІІ БУДУЦЬ ЗАСЛУХАНЫ І АБМЕРКАВАНЫ НАСТУПНЫЯ ДАКЛАДЫ:

21 сакавіка

1. Даклад навуковага работніка З. Р. ЛЕВІНА на тэму: «РОЛЯ АДМІНІСТРАЦЫІ Ў СВЯТЛЕ ЎКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 26/VI 1940 ГОДА».
2. Даклад дацэнта-кандыдата юрыдычных навук М. А. ГЕЛЬФЕРА на тэму: «УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 26/VI 1940 ГОДА І СУДОВАЯ ПРАКТЫКА БССР».

22 сакавіка

1. Даклад дацэнта-кандыдата юрыдычных навук В. Г. ГІНЦБУРГА на тэму: «УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 10/VIII 1940 ГОДА І СУДОВАЯ ПРАКТЫКА».

Сесія праводзіцца ў будынку інстытута (Акадэмічная 4, актавая зала) у 7 гадзін 30 мінут вечара.

ЗАПРАШАЮЦЦА РАБОТНІКІ ОРГАНАЎ СУДА І ПРАКУРАТУРЫ.

ДЫРЭКЦЫЯ.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ НА КРАСАВІК І ДА КАНЦА ГОДА НА ГАЗЕТУ „ЗВЯЗДА"

орган ЦК і Мінскага абкома КП(б)Б.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на 1 мес. — 3 р. 35 к. | на 6 мес. — 20 р. 10 к.
на 3 мес. — 10 р. 05 к. | на 9 мес. — 30 р. 15 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА гарадскімі і раённымі аддзяленнямі Саюздруку, грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку на прадпрыемствах і ва ўстановах, а таксама ўсімі паштовымі аддзяленнямі.

ВЫДАВЕЦТВА «ЗВЯЗДЫ».

БАЛАНС

ЦАГЕЛЬНАГА ЗАВОДА „СТУДЗЁНКА" БАРЫСАЎСКАГА РАЁНА

НА 1-е СТУДЗЕНЯ 1941 г.

АКТЫЎ	СУМА на 1/I 1940 г.	СУМА на 1/I 1941 г.	ПАСІЎ	СУМА на 1/I 1940 г.	СУМА на 1/I 1941 г.
Асноўныя сродкі	1021470—57	1057375—38	Статутны фонд	1268051—97	1245000—16
Матэрыялы і паліва	150729—49	177832—43	Фонд дырэктара	107285—00	103981—15
Поўфабрыкаты і незавершаная вытворчасць	52357—21	77277—36	Рэзервы і прадстаячыя плацяжы	12847—20	23363—65
Гатовая прадукцыя і тавары	124897—88	74054—70	Разлікі з крэдыторамі	83850—01	201462—55
Грашовыя сродкі	103187—05	169049—16	Розныя пасівы	—	7554—23
Дэбіторы (разлікі)	19391—98	24170—33			
Расходы за кошт будучых перыядаў	—	1602—38			
БАЛАНС	1472034—19	1581361—74	БАЛАНС	1472034—19	1581361—74

РЭЗУЛЬТАТЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА 1940 год

УБЫТКІ	СУМА	ПРЫБЫТКІ	СУМА
Убыткі ад стыхійных бедстваў	9850—	Розныя прыбыткі	170261—23
Убыткі па іншых даўгах	1685—16		
УСЯГО	11535—16		
Сальдо прыбыткаў	158726—07		
БАЛАНС	170261—23	БАЛАНС	170261—23

Дырэктар завода БЕЛОЎ.

Галоўны бухгалтар МІГУЦКІ.

Баланс зацверджан Мінскім Облмяспромам (пратакол № 1 ад 15/II 1941 года).

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 20-000 (камутатар), дадаткозы — 102; прыёмная рэдактара — 2-13-52; намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88; адказны сакратар — 2-13-53; намеснік адказнага сакратара — 2-13-99, сакратарыят — 2-39-55 Аддзелаў, загалчык партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, загалчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89; загалчык эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56; літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-18-85; аддзел рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60; заг. выдавецтва — 2-13-58; бухгалтэрыя выдавецтва і аддзел абмену — 2-08-44, выпускаючы — 2-47-88, карэктарская — 2-13-57.

У1639. Друкарня газеты «Звязда». К., Ш., Ш.